# З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

## Жыллё нашых продкаў

Будавалі сабе хаты нашы продкі з хвоі, елкі, а часам і з асіны, бо гэтыя дрэвы лічылі найболып даўгавечнымі і надзейнымі для жытла. Спачатку нарыхтоўвалі лесаматэрыял, а потым браліся за будаўніцтва, якое імкнуліся завяршыць да наступления веснавых палявых работ, касавіцы, жніва.

Памер хаты залежаў ад матэрыяльнага дастатку гаспадара, але і заможныя сяляне не заўсёды будавалі вялікія хаты, бо яны патрабавалі для ацяплення шмат дроў.

Звычайна хата рабілася памерам 7х8 аршын (1 аршын роўны 71,12 см), а хата ў 9 х 10 аршын лічылася вялікай, і не кожнаму пабудаваць было пад сілу. Узводзіліся і хаты з двух пакояў, раздзеленых сцяной, і называліся такія будынкі пяцісценкамі.

Болынасць хат на Крычаўшчыне ў канцы XVIII ст., асабліва ў вясковых паселішчах, былі курнымі, без неякіх упрыгожанняў звонку і нават без сенцаў, часцей з земляною падлогай. У хатах рабілі па адным, два і тры акны (залежна ад памеру) з маленькімі шыбамі, вузкія і падслепаватыя. Паколькі праз вокны ў жытло пранікаў холад, на зіму іх закрывалі саламянымі матамі, а знутры завешвалі тоўстымі посцілкамі.

Нейкі час сцены хаты заставаліся «голымі». Потым іх пачалі абмазваць глінай па кутках і «шпарах» – стыках паміж бярвёнаў, каб закрыць доступ з вуліцы марознаму паветру. А з пачатку XX ст. сцены сталі атынкоўваць. Для гэтага нарыхтоўвалі і сушылі лучыну (тонкую ляшчыну, вербалоз), ею абівалі сцену, а потым абмазвалі глінай, змешанай з мякінай ці дробна нарэзанай саломай і пяском. Трэшчыны, якія з’яўляліся пасля высыхания, «заціралі» вадкім растворам гліны з пяском, давалі час прасохнуць, пасля чаго бялілі крэйдай. Карысць была відавочнай: хата ўнутры набывала прыстойны выгляд і холад не «улазіў» праз сцены. Восенню, да наступления маразоў, фундаменты хат абкладвалі саломай і засыпалі зямлёй, уцяплялі, каб сцюдзёнае паветра не зацякала ў жытло.

Печы рабіліся на драўляным фундаменце (цэгла тады была не таннай). Памер печаў быў вялікі. Зразумець такую акалічнасць няцяжка. Трэба было і немалую сям’ю накарміць, варыць для яе справы, ды і для свойскай жывёлы корм падрыхтаваць. Таму і застаўлена печ была чыгунамі і гаршкамі розных памераў.

З-за матэрыяльнай нястачы не ра-

білася абшыўка хат дошкамі – шалёўка. Перасяленне ў новую хату, «улазіны», стараліся зрабіць да наступления халадоў. Звычайна першым у жытло цераз парог пускалі ката, потым пераносілі рэчы. Кут упрыгожвалі іконамі, якія закрываліся прыгожымі вышытымі ручнікамі. Ручнікі гэтыя часта мылі, разгладжвалі качалкай і вывешвалі на сваё месца. У куце пад іконамі ставіўся стол, звычайна зроблены з тоўстых дошак. На ім снедалі, палуднавалі, вячэралі. Крэслаў і табурэтак амаль што не было, іх замянялі лаўкі ці калодкі з несмалістага дрэва.

Хатняе начынне складалася з некалькіх гліняных гаршкоў, чыгункоў вялікага памеру, патэльні, некалькіх





Вырабы крычаўскіх ганчароў.

місак і балей, драўляных лыжак, не меней адной на сямейніка, дзяжы для выпечкі хлеба, кадкі для вады, рагачоў (вілак) для гаршкоў і чыгункоў, качаргі, вёдзер, у кожнай хаце на загнеце печы мелася ніша. Тут захоўваліоя прысыпаныя попелам гарачыя вугольчыкі. Скажам, трэба прыкурыць, распаліць лучыну, каб спражыць яешню – выкаціў зыркае вуголле і раздзьмухваў, покуль не затрапеча полымя. Трэба адзначыць, што і цяпер на Крычаўшчыне, асабліва ў вёсках, такая ніша на зачысце робіцца ў кожнай печы, толькі згубіла яна сваё ранейшае прыз- начэнне і служыць гаспадыням для іншых мэт.

Надворныя пабудовы складаліся з хлевушкоў (пунь), перагароджаных для асобнага ўтрымання кароў, свіней, авечак, курэй. Будавалі з дробнага лесу, крылі саломай, чаротам. Надворныя пабудовы заканчваліся навесам (павеццю), пад якім захоўваўся гаспадарчы інвентар. Недалёка ад хаты знаходзіўся склеп, які складаўся з выкапанай ямы, абкладзенай бярвёнамі. Зверху склеп таксама пакрывалі бярвёнамі і засыпалі зямлёй, для ўваходу служылі невялікія дзверы. Над уваходам – невялікая паветка, якая мела назву скляпня. Тут звычайна змяшчаліся бочкі, кадкі, цэбры, вёдры і іншыя рэчы, непатрэбныя ў пэўны момант ні ў хаце, ні ў склепе.

Па выгляду вёскі раней можна было беспамылкова вызначыць матэрыяльны дастатак яе жыхароў. Калі хаты нізкія, з дробнага бярвення, урослыя ў зямлю, вокны хат маленькія, падслепаватыя, на крытых саломай страхах закусціўся мох і нават лебяда, то ў кішэнях вяскоўцаў гуляе вецер, яны ледзь зводзяць канцы з канцамі.

Трапляліся вёскі, болыдасць хат у якіх мелі па тым часе даволі прыстой-

ны выгляд. Ашаляваныя, крытыя гонтам, вокны з аканіцамі. Справа тут, канешне, не ў гультайстве адных і высокай працаздольнасці другіх. Сяляне ад цямна да цямна гнулі спіны і на панскіх палетках і на сваіх палосках, але ўзбіцца на капейку, каб агорацць хоць бы з намёкам на прыстойнасць жыллё ніяк не маглі. Нястача была гаспадыняй у іх жыцці.

А ў некаторых вёсках адны сям'і займаліся ганчарнай справай, другія – рамізніцкай, цяслярнай ці кравецкай. Такім у рукі часцей трапляла «жывая» капейка і яны жылі болын заможна, аб чым красамоўна сведчылі іх пабудовы.

Паселішчы вясковыя ўзнікалі паблізу ажыўленых дарог, рэчак, лесу. На першым плане былі жыццёвыя зручнасці: дровы, вада, бесперашкодны шлях да горада, ці буйнога мястэчка. Засяляліся крычаўляне пераважна на пагорыстых мясцінах, з якіх добра праглядваюцца палі, сенажаці, стужка ракі і лес. Прысутнічаў у нашых продкаў эстэтычны густ. Шмат вёсак стаіць у такіх прывабна-маляўнічых мясцінах і так зачароўваюць сэрца навакольнымі краявідамі, што, бачна, не адна толькі гаспадарчая выгода кіравала імі пры выбары месца пасялення, душа прагла і прыгажосці, каб было чым усцешыць вока пасля цяжкага працоўнага дня.

Даволі цесна ляпіліся адна да адной вясковыя хаты на Крычаўшчыне. Тлумачылася гэта недахопам зямлі. А колькі было гарачых спрэчак і сварак між суседзямі з-за межаў, што падзялялі іх зямельныя надзелы. Здасца аднаму гаспадару, што другі ўхапіў на сваю карысць плугам кавалак мяжы, і ўспыхваў лямант, які нярэдка заканчваўся крывавай бойкай.

Сур'ёзную пагрозу вёсцы ўяўлялі пажары. Ад маланкі ці яшчэ з якой-небудзь прычыны загарыцца хата і агонь «выкаціць» усю вёску. Іншы раз і жывёлу не ўдавалася ўратаваць, нават бездапаможныя старыя і дзеці гінулі ў пажары.

Двор багацейшага селяніна істотна адрозніваўся ад бяднядкага не толькі памерам, дабротным знешнім выглядам, але і дапаможнымі прыбудовамі. Будаваў заможнік прасторны хлеў для жывёлы, побач з ім сенавал са страхой і сценамі, далей мясцілася клець, хлеўчукі для курэй, гусей і качак, а таксамі сховішча для калёс, саней і земляробчых прылад. Такім чынам, двор агароджваўся з усіх бакоў прыбудовамі і называўся «круглым». Вароты для ўезду рабіліся двухстворкавыя, з тоўстай шалёўкі. І нярэдка абіваліся тонкім жалезам для большай трываласці.

Гаспадар праз гэтыя вароты вясной вывозіў з хлява на палеткі гной на калёсах, летам завозіў нарыхтаванае сена, дровы, выпускаў у сонечнае над- вор'е на двор свіней.

Гумны ставіліся звычайна далей ад хат. Разлік быў такі: калі, асабліва ў пару ранняй восені, пажар зліжа хату, то гумно ацалее і разам з ім хлеб, не давядзецца ісці па людзях з торбай прасіць зерня.

Хата бедняка ўяўляла відовішча, вартае спачування. Прыгорбленая, часта пабітыя дзецьмі шыбы вокан заткнутыя анучамі, латаная і пералатаная саломай страха, струхнелы падмурак. Нярэдка ў адной такой хаціне жыло па дзве сям'і.

Самай нежаданай для беднякоў парой года з'яўлялася зіма. Маразы і вятры выстуджвалі хату так, што за ноч у вёдрах і чыгунах бралася тонкім лёдам вада. Печ звычайна аддавалі ва

ўладу састарэлым і самым малым дзецям. Маладзейшыя ж гаспадары ратаваліся ад холаду хто як мог. Клаліся на палацях, усцягвалі на сябе армякі, кажухі і рознае рыззё. Укрываліся з галавой, бо сцюжаю патыхала ад сцен, столі, земляной падлогі.

У траскучыя калядныя маразы ў хату бралі нованароджаных ягнятак, цялятак і курэй, каб не змерзлі ў халодных хлявах.

Час ідзе, няспынна рухаецца і ўносіць у жыццё свае змены. Пастулова, хоць і ў запаволеным тэмпе, мяняўся выгляд крычаўскіх сельскіх паселішчаў як з вонку, так і ўнутры. Знікалі курныя хаты, дзе стаяў густы смурод дыму, а на сценах сырэла ліпкая чарната, маленькія акенцы, што скупа прапускалі святло дня, неадгабляваная столь.

У пачатку ХХ ст. сяляне пры будаўніцтве хат пачалі рабіць сенцы, рубіць больш высокімі вокны і павялічваць іх колькасць, атынкоўваць сцены. Папрыгажэлі і стрэхі, бо многія крылі іх саломаю пад «грэбень». Такая страха надавала хаце фарсісты выгляд і не прапускала дажджавую ваду.

Больш увагі сталі людзі ўдзяляць і навядзенню ўнутранага хатняга парадку. У каго была дашчаная падлога, рэгулярна мылі яе, сцены ўпрыгожвалі адбеленымі і вышытымі ручнікамі, сталы імкнуліся засцілаць прыгожа вытканымі сурвэткамі. У агародчыках, пад вокнамі садзілі бэз.

Канешне, ні ў якім разе нельга параўнаць хату сённяшняга вяскоўца з жыллём людзей таго часу. Бо тады хата з'яўлялася не толькі надзейным сховішчам ад халадоў і дажджоў, але і служыла своеасаблівым складам для захоўвання харчовых прадуктаў. Пад падлогай, у выкапанай яме, знаходзілася бульба, буракі, рэдзька, дзе-небудзь у вуглу ляжалі гарбузы, на зіму ўкочвалі сюды і бочку з салёнымі гуркамі і квашанай капустай, ратуючы ад маразоў.

Крэслы не былі ў пашане ў сельскіх жыхароў Крычаўшчыны таго часу. Пэўна, з-за высокай, не кожнаму даступнай цаны іх замянялі лаўкі, што стаялі ўсцяж сцен, і кароткія ўслоны.

Абедзенны стол стаяў у куце пад іконамі. Есці заўсёды садзіліся сям'ёй. Калі хто-небудзь прыпазняўся, чакалі, і стравы даставаліся з печы толькі з яго з'яўленнем. Елі з адной місы па некалькі чалавек. Місы былі гліняныя, глыбокія і шырокія. Ашчадна адносіліся да хлеба. Нават дзеці, калі крошкі са скібы падалі на стол, падбіралі іх і адпраўлялі у рот. Падсілкаваўшыся, усе дзякавалі Богу за сняданак, абед ці вячэру і разыходзіліся, каб заняцца сваёй справай.

Спалі на сшытых з ільнянога палатна матрацах, набітых саломай. Такія ж былі і падушкі. Калі салома праціралася як не на мякіну, яе вытрасалі і набівалі свежай. Навалачкі, коўдры былі толькі з даматканай матэрыі, пасцельнымі рэчамі фабрычнага вырабу вяскоўцы не карысталіся.

Доўгі час хаты асвятляліся лучы- най. Пры такім мізерным святле людзі ўмудраліся і ткаць, і прасці, бо выконвалася гэта праца пераважна зімовымі вечарамі, калі дзень кароткі, а ноч бясконца доўгая. Потым на змену лучы- не прыйшла газавая лямпа. Спачатку яна з'явілася ў багацейшых вяскоўцаў, потым на яе набыццё сталі адкаштоўваць грошы і беднякі.

Да кожнай хаты прыбудоўвалі крычаўляне сенцы. Памер іх залежаў ад матэрыяльнай магчымасці гаспадара.
У сенцах гаспадыня таўкла бульбу, рабіла мешанку свінням, мыла посуд і

бялізну, рыхтавала да заквашвання капусту, саліла агуркі, памідоры. Тут жа захоўваліся і неабходныя рэчы дамашняга ўжытку, а таксама некаторыя харчовыя прадукты.

Пачалі сяляне з цягам часу і ўпрыгожваць мясціны каля сваіх хат. Садзілі рабіны, бярозы і вярбу. Невядома чым упадабалася крычаўлянам вярба, можа тым, што ў песнях часта тэта дрэва падаецца сіратой, сумнай і пакрыўджанай, але ў большасці вёсак на вуліцах растуць менавіта вербы. Тоўстыя, раскідзістыя. Каля іх днём гарэзавалі дзеці, а вечарамі збіраліся хлопцы і дзяўчаты. Да пазна рыпаў гармонік, гучалі песні.

*З.М. Скачкова.*

# Вопратка і абутак

Няцяжка ўявіць, што за абутак і вопратка былі ў напхых старажытных продкаў, бо майстравалі яны іх, каб абараніць цела ад холаду, укусаў змей. Паступова чалавечы разум падказваў спосабы ўдасканальвання вопраткі, абутку ў бок практычнасці, надзейнасці і прыгажосці.

Вось якую вопратку на крычаўлянах убачыў Андрэй Меер у XVIII стагоддзі.

«... Одежда здешних крестьян состоит летом в пеньковых касталонах или, по-российски, балахонах, а на переплетённых оборами наподобие латышей ногах носят они сплетенные из одного только лыка плоские с петлями каверзни или из пяти лык – пятирники: сверх своих касталонов носят они зимою белые домоткального сукна свиты или окрашенные из спагож синие кафтаны из собственной своей, два раза в год, то есть весной и осенью, с овец состригаемой шерсти.

Летом прикрывают они свои головы валеными из белой шерсти наподобие русских больших от шляп тулей колпаками. Большая их от других отличность состоит в кожаных на таковых же ремнях сумках.

Женщины летом носят пёстрые из домоткального сукна паниовы и каразейные передники, а зимою шталты, или род безрукавных корсетов. Оные состоят обыкновенно либо из каразея, либо из домоткального сукна, а иногда из шёлку, и обшиваются холстиною... сверху покрываются оне мужскими свитами.

Женщины волосы свои наподобие российских плетут в две косы, которые, покрывая зборником с рожками, увивают последние белою из четырёх аршин холстиною нометкою, коей конусы оставляются на зади наподобие лопастей.

Девки головы убирают на еврейский образец, заплетёнными вверх двумя косами и завязанными на перед бантом: чело покрывают разных метарий белыми повязками, а шеи свои с бабами наравне украшают состоящими из окрашенных из воску кралей ожерельями, в середине коих навешивают иногда вырезываемые из верезубовой гортани, которые оправляют в медные кольцы. У еврейских жён переняли.

В местечках живущия достаточные женщины только тем отличаются, что богатые одежды носят и головы свои польскими черными из плису или бархата повязками одевают. Сии повязки большей частью обшиты бывают

либо шёлковым кружевом, либо золотою сеткой, и носятся сверх каптура или рода русских древних с ушками шапочек. Мещане отличаются носимою ими на польский шляхетский образец одеждою». Мейер Андрей. Описание Кричевского графства. Могилёвская старина. Выпуск II. Могилёв, 1901 г. С. 96.

XIX і пачатак XX ст. унеслі значныя карэктывы ў адзенне і абутак як крычаўлян, так і насельніцтва ўсёй Беларусь Гэтаму паспрыяў тэхнічны прагрэс, з'яўленне дробных і буйных фабрык па выпуску розных тканін, па пашыву вопраткі і абутку, усюды гандлявалі мануфактурай незвычайна яркіх і прыгожых колераў. Скуру таксама пачалі вырабляць больш якасна. Для тых, хто меў грошы і любіў элегантна апрануцца, тэта з'явілася святам. Мануфактурныя тавары сталі даступнымі. Але сяляне засталіся вернымі традыцыйнаму строю. Па-ранейшаму перавагу аддавалі яны рэчам надзейным, цёплым і не асабліва далікатным ва ўжытку.

Жанчыны насілі сарочкі, спадніцы з даматканага, добра адбеленага палатна. Каўняры сарочак і рукавы да локцяў упрыгожваліся вышыўкамі. Многія паверх сарочак надзявалі безрукаўкі, якія зашпільваліся на гузікі, іх называлі кабатамі. Кабаты стараліся мець вабна зіхоткага колеру, і шылі іх з крамнай (фабрычнай) тканіны.

Насілі жанчыны і андаракі. Сукно на іх шыццё ішло ўласнай вытворчасці, колер таксама падбіраўся кідкі, ужываўся як у паўсядзённым, так і ў святочным строі фартух. Шылі фартухі са стараннем, з тонкага самаробнага палатна, па-майстэрску аздаблялі ўсялякай вышыўкай. Шырокія, у большасці аж у тры паласы, фартухі з'яўляліся часткай строю крычаўлянак. Фартухі насілі паўсюль, у іх хадзілі ў царкву, з'яўляліся на пагулянках.

У летні час асноўным мужчынокім адзеннем былі штаны і кашуля. Іх надзявалі і ў святочныя дні. Кашулі былі як белага колеру, так і квяцістыя. Шыліся з даматканага палатна, з тканіны фабрычнай вытворчасці. Звычайна каўняры рабіліся стаячымі, нярэдка іх упрыгожвалі вышыўкай. Кашулі шы- ліся доўгімі, ледзь не да кален, таму іх абавязкова падпяразвалі поясам з кутасамі. Паясы былі вязаныя, тканыя, плеценыя і служылі не толькі ўпрыгажэннем мужчынскага строю, але і дапаможным сродкам. Людзі пажылога ўзросту падвешвалі на іх кісеты з самасадам, крэсіва.

Калі ў крамах з'явіўся шырокі выбар тканін фабрычнай вытворчасці, у вёсках пашырылася кола мясцовых краўцоў. І, трэба адзначыць, без працы яны не засталіся. Бо з самаробнага палатна многія сяляне шылі сабе вопратку самі, а з фабрычнага – заказвалі добраму спецыялісту.

Зімой мужчыны насілі світкі, пашытыя з сукна і паўсукна дамашняга вырабу. Калі з'явілася ў продажы шмат фабрычных фарбавальнікаў, то і світкі сталі фарбаваць у розныя колеры. Пераважаў звычайна цёмны, карычневы. На вялікія маразы шылі кажухі. Іх насілі нетолькі мушчыны, але і жанчыны, дзяўчаты.

Аўчыны фарбавалі ў дубовай, альховай кары, часам абыходзіліся без афарбоўкі. Шылі кажухі і паўкажухі. У такой вопратцы не даймаў ні вецер, ні мароз. Галаву ў халады пакрывалі шапкай-вушанкай. Зроблена яна была з аўчыны, меху труса, зайца. Не па кішэні былі сялянам галаўныя ўборы з бабровага, лісінага і кунічнага меху,

такія шапкі насілі багацеі. У летні час мужчыны карысталіся кёпкамі і картузамі.

Жанчыны насілі хусткі, касынкі. Летам – лёгкія, з тонкай тканіны, пераважна фабрычнага вырабу, усялякага колеру афарбовак, зімой – цёплыя, шарсцяныя ці суконныя.

Доўгі час асноўным абуткам крычаўлян з'яўляліся лапці. Дралі лыка з кары ліпы або лазы, сушылі, а потым плялі. Няхітрая на першы погляд работа патрабавала ўмення і спрыту. Не кожны мог яе рабіць. У лапцях мужчыны, жанчыны, дзяўчаты летам упраўляліся па гаспадарцы, хадзілі на сенажаць, наведвалі царкву і з'яўляліся на пагулянкі. Кожны назапашваў для сябе некалькі пар ануч, для будзённага дня і свята. Для кожнага дня на анучы выкарыстоўвалі самаробную палатнянаю тканіну, а на святы – пяшчотную, дбайна адбеленную, мяккую і чыстую. Каб лапці не так хутка стоптваліся, іх падшывалі сырамятнай скурай, лямцам. Спрабавалі многія насіць і чуні – абутак накшталт лапцяў толькі сплецены не з лыка, а з тонкіх вяроўчын.

З наступлением маразоў сяляне абувалі валёнкі. Паколькі займець галёшы не кожны мог з-за іх высокай цаны, то на валёнкі надзявалі лапці.

Паступова ў быт сялян пачаў ухадзіць скураны абутак. Боты, туфлі, чаравічкі, як жаночыя, так і мужчынскія. Скураны абутак саматужнай і фабрычнай вытворчасці лічыўся каштоўнай рэччу і да яго адносіліся беражліва. Трэба, скажам, селяніну трапіць у горад. А да яго пятнаццаць вёрст. Узнімаецца чалавек досвіткам, адзяецца і – ў дарогу. Прастуе басанож, ногі халадзіць раса, а боты на плячы вісяць. Ля першых дамоў горада абувае іх селянін і рухаецца далей. Парабіўшы свае справы, ён выходзіць з горада і разуваецца, зноў боты на плячо ўскідвае. Дома іх старанна выцірае ад пылу і на шасток падвешвае. Такім жа самым чынам паступалі і жанчыны, ашчаджаючы свой скураны абутак.

Нярэдка здаралася, што паміраў чалавек, а купленыя некалькі дзесяткаў гадоў таму боты ці чаравічкі мелі выгляд быццам толькі з крамы.

Усе тэта сведчанне таго, што большасць сельскага насельніцтва Крычаўшчыны ў канцы XIX – пачатку XX ст. мела нізкі узровень жыцця, не дастатак, а нястача гаспадарыла ў хатах працаўнікоў палёў.

Нельга сказаць, што ў тэты час гараджане раскашавалі. Багацеі багацелі, а дробныя рамеснікі так-сяк зводзілі канцы з канцамі. Ім было не да баляў шыкоўных, не да моднай і дарагой вопраткі.

## Як адзначалі святы

Поры году ўяўляліся нашым предкам як жывыя багі і багіні, якія па чарзе прыходзяць на зямлю і ўладараць над ёй пэўны тэрмін. Вясну яны называлі дзяўчынай гожай і добрай, лета – малойцам прыгожым і багатым, восень лічылі падобнай на жанчыну старую, але багатую і шматдзетную, а зіму – бязлітаснай жонкай, мачахай.

Адным з самых цікавых і, напэўна, найважнейшым быў цыкл веснавых святаў. Вясной абуджалася прырода, пачыналіся клопаты аб будучым ураджаі, ад таго, наколькі цёплай будзе яна, залежалі дабрабыт і лад жыцця чалавека. І таму гуканню вясны крычаў- ляне надавалі сур'ёзную увагу.

25 сакавіка (на Благавешчанне)

83. Зак. 808.

моладзь збіралася на грудах ці ўзгорках за сялом. Дзяўчаты спявалі пеені, так званыя вяснянкі. Актыўна ўдзельнічалі ў абрадзе жанчыны і дзеці. У некаторых вёсках раскладвалі вогнішчы, спальвалі непатрэбныя старыя рэчы. Гэта сімвалізавала «праклён» холаду, голаду, злу, смерці і ўслаўленне пачатку абнаўлення жыцця.

Дзяўчаты спявалі:

Благаславі, маці,
Вясну загукаці.
На новае лета,
На густое жыта!

Памажы, Божа,
Нам вясну гукаці!
Зарадзі, Божа,
Лета цеплыя!

Песні выконваліся розныя. Але ў кожным тэксце прысутнічала традыцыйнае пажаданне добрага ўраджаю, ад якога і палі, і пуні, і клеці поўныя, а гэта значыць у хатах пануе сытасць і весялосць.

А святое Благавешчанне,
Благаславі, Божа.
Благаславі, Божа,
Дай, Божа, вясну-красну.
Дай, Божа, вясну-красну
Ды на цеплыя лета,
Ды на цеплыя лета,
Ды на густыя жыта.
На густыя ядраністыя,
Коласам каласістыя!
А ў полі капамі,
А ў клеці кырабамі.
А ў клеці кырабамі
А на стале пірагамі.

У напеве чуюцца спаконвечныя замоўна-заклікальныя інтанацыі, звязаныя са старадаўнімі магічнымі абрадамі заклікання добрага надвор’я, шчодрага намалоту і г.д. Людзі да вясны звяртаюцца як да адухоўленай асобы і спадзяюцца, што іх просьбы не застануцца без увагі. Цыкл веснавых песень уяўляе сабою цэласную лагічную сістэму, дзе кожны элемент надзяляецца асаблівым сэнсам.

Вясна-красна,
Што ты нам прынесла?
– Малым дзеткам –
Па яечку,
Старым бабкам –
Па кіёчку,
Маладым жонкам –
Па сыночку,
Красным дзеўкам –
Па вяночку,
Маладым хлопцам –
Па канёчку.

Песні-вяснянкі прываблiваюць яскравай паэтычнасцю, непаўторнай манерай выканання, асаблівай меладычнасцю і эмацыянальнасцю. Абрад гукання вясны праходзіў весела, займальна, людзі нібы прачыналіся пасля зімовых халадоў, узбадзёрваліся, жвавелі. Вось што пішаў кнізе «Календарно-песенная культура Белорусии» (Мн., 1985г. с 23) З.М.Можейко: «Из всего календарного цикла поэзия весенних праздников, пожалуй, в наибольшей степени сохраняет элементы древних анимистических представлений. Их следы можно усмотреть и в весеннем сближении человека с природой, когда все обряды, обычаи и песни выносятся на открытый воздух (на волю), а главной действенной силой песенной обрядности становятся переклички человеческих голосов с голосом природы».

Пасля абраду гукання вясны не за гарамі ўжо і Вялікдзень. Да гэтага свята рыхтаваліся старанна. Мылі падлогі, бялілі печы, убіралі смецце адусюль, куды яго панакідалі гнілая восень і марозная зіма. Агонь выкарыстоўваўся з практычнай і магічнай мэтай: зга-

рала смецце і разам з ім усё благое, што дастаўляла непрыемныя клопаты гаспадарам.

У «чысты чацвер» вуліцы вёсак засцілаў смалісты дым, які густа цёк з кожнай лазні. Крычаўляне мыліся ў лазнях да ўсходу сонца. Вада ачышчала, давала сілы, бадзёрасць, засцерагала гаспадарку ад мору, благога вока і іншага ліха, змывала ўсё кепскае.

На Вялікдзень у кожнай хаце сталы былі накрыты па-святочнаму. На кожным сямейніку красавалася святочная вопратка. Да страў, якія елі ў вялікодныя дні, фарбаваных яек, хлеба (караваю), шматлікіх страў са свініны – ставіліся як да абрадавых атрыбутаў. Ужыванне гэтай ежы прыраўноўвалася да магічных дзеянняў. Іх прызначэнне – забяспечыць урадлівасць зямлі, добры ураджай, даць зда- роўе, сілу земляробу і яго сям'і. У пер- шы дзень Вялікадня ў печах не палілі і нічога не гатавалі, харчаваліся загадзя прыгатаванымі і асвячонымі да свята прадуктамі.

Пірагі, булкі, каравaі, выпечаныя з вялікім майстэрствам, (так званая паска) паўстаюць як сімвал сонца, як родапачынальнік, захавальнік дастатку. З іх дапамогай на Вялікдзень клікалі не толькі новы ураджай, але рабілі спробу вызначыць, які ён будзе. Для гэтага каравай неслі ў поле і клалі сярод парасткаў жыта. Калі парасткі перакрывалі каравай, ураджай чакаўся добры, калі не – кепскі.

Яйка таксамса займала пачэснае месца ў святочнай ежы. Каб зямля радзіла, яйкі клалі ў зямлю. Іх таксама качалі па могілках сваякоў, а потым закопвалі, у продкаў прасілі заступніцтва і дапамогі ў барацьбе за ўраджай. Даволі распаўсюджанай на Вялікдзень была гульня яйкамі ў біткі.

Вялікдзень немагчыма было ўявіць без валачобнікаў. Збіраліся яны па некалькі чалавек, выбіралі запявалу. Ён павінен быў мець добры голас, ведаць шмат песен і, як кажуць, не лезці ў кішэню за словам. Валачобнікі абыходзілі двары аднавяскоўцаў, віншавалі гаспадароў са святам, спявалі ім валачобныя песні і атрымлівалі за гэта фарбаваныя яйкі, пірагі, мяса, сала, каўбасу і іншы харч. Часта валачобнікаў зазывалі ў хату і частавалі святочнымі прысмакамі.

Звычайна падыходзілі валачобнікі да хаты і адзін з удзельнікаў абходу пытаўся ў гаспадара: «Ці можна са святам павіншаваць?». Атрымаўшы станоўчы адказ, зацягвалі песню.

Дай жа, Божа, гаспадару,
Жыці-быці, сто бочак жыта намалаціці,
Паўбочкі прадаці, валачобнікам даці.

Валачобны рэпертуар даволі багаты. Тут і пажаданні гаспадарам багацця, любоўная і шлюбная тэматыка, зычанне шчаслівай долі, здароўя дзецям, а таксама росту і прыплоду хатняй жывёле. Адспяваўшы ў хаце ці пад яе вокнамі загадзя падрыхтаваныя для кожнага гаспадара песні, атрымаўшы за гэта пачастунак, валачобнікі звычайна развітваліся:

А на дварэ стаіць дубок,
Хрыстос васкрэс, сын божы!
А на дубку сінь галубок.
Выйшау, выйшау млады Йванька,
Меціў стрэліць у галубка.
- Не бі мяне, не страляй мяне,
Я ж табе прыгаджуся,
А як будзеш жаніціся,
Як будзеш браць за гарамі,
За гарамі, за марамі,
Будзеш прасіць піравозчыкаў,
Будзеш прасіць, не ўпросішся,
А я ж цябе піравязу:
Цябе з Марынкай на хрыпточку,
А радзінку на хвасточку.

Закончыўшы абход двароў аднавяскоўцаў, валачобнікі ішлі дзяліць сваю здабычу і рабілі гэта з гумарам і святочным ажыўленнем.

Калі на Вялікдзень крычаўляне лічылі за вялікі грэх убіць цвік у сцяну, то на Раданіцу гаспадары з раніцы займаліся рознымі хатнімі справамі. Гаспадыні рыхтавалі ежу. Потым апраналіся ва ўсё святочнае і кіраваліся на могілкі. Засцілалі магілкі сваякоў квяцістымі абрусамі, ставілі на іх пачастунак, але нейкі час да ежы і выпіўкі не дакраналіся. Потым першую чарку налівалі нябожчыку і ставілі на магілку.

На сёмым тыдні пасля Вялікадня святкавалася Тройца. Тройца – царкоўна-хрысціянская назва, прымеркаваная да язычніцкіх святаў. У самой назве «Тройца» заключаецца адзін з асноўных дагматаў хрысціянскай праваслаунай веры – трыадзінства Бога-айца, Бога-сына і Святога Духа (Духаў дзень).

Напярэдадні Тройцы вяскоўцы старанна прыбіралі ў хатах, а потым адпраўляліся ў лясы, на рэчку, ірвалі явар, секлі маладыя дрэўцы: бярозку, клён, ясень, ліпу, або наламвалі з гэтых дрэў цэлае бярэма галінак. Дрэўцы ставілі ля парогаў хат, а галінкамі ўпрыгожвалі сцены хат, гаспадарчыя пабудовы, явар рассыпалі па падлозе. Цэрквы таксама аздабляліся зелянінай.

Траецкія абрады станавіліся сапраўдным святам маладой, але ўжо акрэплай зеляніны. Ёй прыпісвалі магічныя ўласцівасці. Галіны дрэў, асабліва асіны, павінны былі засцерагчы ад усялякай нечысці. Абаранялі ад злых сіл палын, любісток. Галінкі дрэў, кветкі і травы, якія асвячаліся на тройцу і захоўваліся на працягу года, павінны былі прадухілць навальніцу і градабой: «при наступлении грозовых туч (их) жгут на медленном огне для отвращения грозы» (П.Шейн. Материалы быта и языка русского населения северо-западного края. Т. 1-3. СПБ, 1887 г. Т 1. 4.1 С. 185). Сабраным на Духаў дзень кветкам і травам адводзілася роля лекавых. Імі «абкурвалі» хворых, карысталіся ад перапуду і сурокаў.

Расправа з бярозай давала нашым продкам веру, што пакінутая на полі ці кінутая ў ваду яна павінна перадаць сваю раслінную сілу зямлі, садзейнічаць росту хлябоў, засцерагчы пасевы ад стыхійных бедстваў.

Крычаўляне цвёрда верылі ў павер’е, што разам з веснавым абуджэннем прыроды ажываюць і душы памерлых, якія трэба падтрымліваць ежай, піццём і цяплом некалькі разоў у год. У знак любові і павагі да сваіх сямейных продкаў наладжваліся памінальныя сталы – «дзяды». «Дзяды» спраўляліся вясной і восенню.

Веснавыя дзяды праводзіліся ў суботу, напярэдадні Тройцы. Гаспадыня прыбірала ў хаце, гаспадар наводзіў парадак на двары. Перад правядзеннем абраду сям’я абавязкова мылася у лазні. Колькасць страў якія гатаваліся для святкавання, павінна быць няцотнай. І да гэтага часу у вёснах гатуюць на пахаванні і «дзяды» «канон» – з хлеба, мёду, вады, салодкі напітак. «Канон» пілі па чарзе, па тры лыжкі кожны чалавек. Снедалі моўчкі, кожны адкладваў у прызначаную міску для памерлых кавалак якой-небудзь ежы, а потым гэту пасудзіну пакідалі на стале. І пры гэтым гаварылі: «Няхай са святыми пачивают, а нам хлеба-соли засылают» (Н.Никольский. Дохристианские верования и культы днепровских славян. М., 1929.

С. 23). Жывыя спадзяваліся, што іх памерлыя сваякі будуць усяляк аказваць дапамогу, таму і звярталіся да «дзядоў» з запрашэннем да сямейнай трапезы.

Купальскае свята з'яуляецца адным з самых паэтычных і маляўнічых, насычаных рознымі паданнямі і легендамі. Быццам бы ў гэтую ноч расцвітае папараць а дванаццатай гадзіне, і той, хто знойдзе яе кветку, будзе шчаслівым. Яму стануць падуладны ўсе схаваныя ў зямлі клады, ён стане разумець мову дрэў звяроў, птушак.

У купальскую ноч дрэвы нібы пераходзяць з месца на месца, рэкі свецяцца дзівосным святлом і адбываецца разгул нячыстай сілы, шабаш вядзьмарак.

Святкавалі Купалу крычаўляне ўрачыста, весела. Выбіралі ўзвышанае месца, а нярэдка і берагі рэк ці азёр, распальвалі там вечарам вогнішча. Чым вышэйшым будзе вогнішча, тым болын ураджайным жыта. Вядомы рускі філолаг А. Пацябня пісаў: «Купальские и другие им подобные огни имеют силу давать урожай и прогонять смерть не сами по себе, а потому, что олицетворяют солнце» (О некоторых символах в славянской народной поэзии». Харьков, 1914. С. 163).

Кожны прысутны абавязкова пераскокваў цераз вогнішча. На агні спальвалі «май» – засохлую зяляніну, якая вывешвалася у хатах на Тройцу. Тэты дым лічыўся ачышчальным і гаючым, ім не толькі акурвалі дзяцей, хворых, але нярэдка вакол вогнішча абводзілі жывёлу. У некаторых месцах кідалі ў агонь усялякія прадметы і прыгаварвалі: «Каб гадавалася скаціна», «Зарадзі, жыта», «Зарадзі, лён». Каб ахаваць ураджай ад вядзьмарак і ведзьмакоў, у жыта кідалі галавешку з купальскага вогнішча.



У купальскую ноч.



Дзяўчаты пускаюць на ваду вяночкі.

Хлопцы і дзяўчаты ды людзі пажылога ўзросту спраўлялі абавязковае купанне ў раках, азёрах ці вадаёмах. Бо купальская вада, па паданню, валодае жыватворнай, гаючай і пладаноснай сілай, ад яе людзі робяцца прыгожымі.

Дзяўчаты плялі вянкі і пускалі на ваду. Глядзелі, куды яны паплывуць, у той бок дзяўчына пойдзе замуж. Калі ж вянок патоне, гэта прадвяшчала няшчасце. Гучала шмат песень, тэматычна-разнастайных, але непасрэдна звязаных са святам.

Шла Купалка сялом, сялом,
Ай, рана, на Йвана.
Закрыўшы вочкі пяром, пяром,
Сталі людзі дзівіціся,
Стала Купалка сварыціся:
- Ідзіце туды дзівіцеся,
Дзе будзе Іванька жаніціся.
Ён сам едзець у вазочку,
Дзявочка яго – у вяночку.
Ён сам сядзіць, як жар гарыць,
Дзявочка яго, як мак цвіціць.

***

Сягоння Ян, заўтра Іван
Дзеўкі зёлкі збіралі.
Што за зёлкі, не зналі
І да цара паслалі.
А цар зёлак не пазнаў,
Да царэўны ён паслаў.
А царэўна пазнала,
Усю праўдачку сказала.
Гэты зёлкі – купалінкі,
Гэты дзеўкі – паненкі.

У пажылых жанок песні гучалі так:

У Купалачкі тры дачкі.
Купала на Йвана!
Адна дачка тонка, высока.
Купала на Йвана!
Другая дачка бела, румяна.
Купала на Йвана!
Трэцяя дачка тоўста, гарбата.
Купала на Йвана!

Або:

Купалка Йвана на вулку звало.
- Ні маю часу, Купалачко
Пайду ў жытнае жыта глядзеці,
Каб міня ведьма ні вітала,
У жыці калосся ні зрывало.
У кароў малокі не адбірало.

Вядома ж, у купальскую ноч моладзь не толькі ўдзельнічала ў рытуальным абрадзе, але і сваволіла. Разбіралі масткі, затыкалі анучамі каміны хат, падпіралі дзверы, каб ніхто з жытла не мог выйсці, зносілі на дарогу пліты і г.д.

У купальскую ноч, як і ў ноч на Ка-

ляды, дзяўчаты, жанчыны і хлопцы варажылі на сваіх суджаных, замужнія – аб сваім будучым жыцці. Пад ложак у галовах ставілі пасудзіну з вадой і замыкалі яе замком. Чакалі, што ў сне прыдзе суджаны і адамкне замок ключом. Або на пасудзіну з вадой клалі прадмет, які быў падобны на масток. Суджаны павінен быў у сне прайсці ці праехаць цераз тэты масток.

Харчаваліся на купальскія ўрачыстасці таксама па-святочнаму. Смажылі яешню, пяклі бліны, варылі верашчаку, кулагу (каша з талакна ці ячменю). Канешне, абавязковай на кожным стале была і чарка гарэлкі.

У заключэнне хочацца сказаць; што на Купалу даволі рана прачыналіся вяскоўцы. Яны ішлі на пагоркі і назіралі за ўсходам сонца, глядзелі як яно «іграе», свавольна скача і разыходзіцца радужнымі кругамі.

Купальскі абрад не памёр. Ён, перасэнсаваны, працягвае жыць і цяпер, з'яўляецца жаданым святам для людзей, якія яго адзначаюць паважліва і весела.

*В. Ф.Кулiненка.*

## «Мяне замуж выдавалі...»

Вясельная абраднасць крычаўлян мала чым адрозніваецца ад такой жа абраднасці ў іншых мясцінах усходняй Беларусі. Спачатку да нявесты накіроўваліся сваты. Бацька, маці жаніха, яго родныя. Абавязкова ў лік сватоў уключалі якога-небудзь аўтарытэтнага ў вёсцы ці горадзе чалавека, звычайна заможнага і гаспадарлівага.

Бралі з сабой гарэлку, віно. Закускі выстаўлялі бацькі нявесты. Першая частка запоін праходзіла весела, асабліва, калі галоўны сват, перавязаны ручніком з багатай вышыўкай, быў на язык востры, схільны да гумару (такога ўсе імкнуліся выбраць). Ён шчодра сыпаў прымаўкамі, забаўнымі анекдотамі і пацяшаў тых, хто сабраўся за сталом.

Потым пераходзілі да справы. Дабіўшыся згоды бацькоў аддаць дачку замуж, пачыналі дэталёва абмяркоўваць дату вяселля, месца жыхарства маладых, памеры пасагу, які выдзеляць абодва бакі для падтрымкі новай сям'і. Развітваліся сваты з бацькамі нявесты ўжо як сваякі: абдымаліся і цалаваліся.

Вядома, кожныя бацькі жадалі выбраць сабе зяця ці нявестку з багатага двара, і калі такое здаралася, былі надта задаволенымі.

Звычайна маладыя паміж сабой згаворваліся да сватання. Але здараліся і выпадкі, калі жаніх і нявеста ў вочы не бачылі адзін аднаго. Сустракаліся толькі ў час сватання. Ажаніць іх дамаўляліся бацькі.

Маладых вянчалі ў царкве. Вяселле не гулялі ў Піліпаўскі, Велікодны, Пятроўскі, Спасаўскі пасты. Выбіралі такія часы для гульбішчаў, калі з поля было ўсё вырашчанае звезена і абмалочана і сена назапашана, а ў хлявах сыта рохкалі ўкормленыя вепручкі, у паграбах упарадкавана стаялі дары агарода. Вось тады марознае паветра далёка разносіла голас вясельных званочкаў.

У дзень вянчання бацькі жаніха благаслаўлялі яго да шлюбу, потым сябры і радня садзіліся на сані (летам – на калёсы), і святочна ўпрыгожаныя коні неслі іх да дома нявесты. Яна, прыбраная да шлюбу, ужо чакала з сяброўкамі жаніха: нявесту трэба было

«выкупіць» у сяброўак. «Торг» вялі сябры жаніха. Звычайна «аплочвалі» нявесту смачным віном, цукеркамі, якімі-небудзь дзявочымі ўпрыгажэннямі. Потым маладых благаслаўлялі хлебам і соллю маці, бацька і хросная маці нявесты. Адсюль вясельны поезд браў кірунак да царквы.

Дрэннай прыкметай лічылася, калі святочны картэж сустрэнецца з пахавальнай працэсіяй, дарогу перабяжыць чорная кошка ці пройдзе хто з пустым вядром.

Пасля вянчання вярталіся ў дом нявесты. Ля варот маладых сустракалі бацька і маці нявесты. Падносілі ім хлеб з соллю і налівалі па чарцы гарэлкі, якую яны два разы вылівалі цераз плячо назад (гэтым усё нядобрае ад сябе адкідвалі), а трэці раз выпівалі Потым жаніха і нявесту абсыпалі жытам, каб яны мелі хлеб і да хлеба, і вялі іх у хату, садзілі ў кут пад абразы.

Нагуляўшыся, выпраўляліся ў дом да жаніха. Нявеста абавязкова брала з сабой пасцельныя рэчы: коўдру, падушкі, прасціраллы, ручнікі, абрусы. Тут ужо свёкар са свякрухай сустракалі хлебам і соллю. Вяселле гулялі па два-тры дні.

## Нараджэнне дзіцяці

Усім, вядома, хочацца каб дзіця нараджалася не толькі прыгожым, здаровым, разумным, але каб і лёс яго напаткаў добры, удачлівы. На гэта і былі накіраваны традыцыйныя рытуалы, звязаныя з паяўленнем немаўляці на свет.

Адразу пасля нараджэння дзіцяці ва ўзгалоўі маці клалі прадмет, які павшей быў уберагчы жанчыну ад сурокаў (часцей за ўсё гэта быў бярозавы венік). Над нованароджаным бабка-павітуха чытала спецыяльную замову: «Першим разом, лепшим часом, поможи ме, Господзи, подзйўкі зговорици з (імя дзіцяці), з гэтага стану, з черных очей, з шыроких плечей, з синих жил, з жоўтой косьци, з румяного лица, з чорного волоса. Мо вы подуманные, мо вы погаданные, мо вы женоцкіе, мо вы дзевоцкіе, мо вы поробацкіе, мо вы свитальные, мо вы змеркальные, мо вы паўночные, мо вы утренніе, – по косьцях же вы ходзіце, косьцей не ломице, личка не хмурице. Досюль же вы кололи и пороли, ек мойго духу не чули, – цепер же полюбице мой дух мой дух: легеньки и цёпленьки. Я ж вам прошу, молю, ссылаю и зговораю, за сухія леса, на ницые лозы, гдзе вецер не вее, гдзе сонца не грее, гдзе людзи не ходзюць, гдзе пташки не летаюць». (П. Шейн. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1893. Т.2 С. 534.)

Праз некалькі дзён пасля нараджэння дзіцяці бацькі павінны былі выбіраць хросных. Хросны бацька не пакідаў без увагі хрэсніка на працягу ўсяго жыцця і займаў у яго лёсе важнае месца. Хросная маці таксама клапацілася аб сваім падапечным.

У хросныя бацькі звычайна запрашалі людзей заможных, аўтарытэтных, запрашэнне ў хросныя лічылася вялікім гонарам, адмовіцца ад якога было нельга. У дзень прызначэння для хрэсьбін у доме бацькоў нованароджанага збіраліся госці. Хросная маці, увайшоўшы ў хату, выказвала добрыя пажаданні, клала на стол бохан хлеба і адорвала падарункам сваю куму, маці дзіцяці.

Хрысціць дзіця везлі ў другой палове дня, перад выхадам бласлаўляючы хлебам. Выносячы дзіця з, дому, кум станавіўся правай нагой на сякеру ді грэбень. Хросным у дарозе забаранялася размаўляць, каб дзіця не было крыклівым. Калі праязджалі цераз мост, яны павінны былі злезці з калёсаў ці саней і прайсці па ім пешшу, трымаючы дзіця на руках. Потым, абвярнуўшыся, плюнуць на мост тры разы і кінуць на яго жменю сена. Пасля хрышчэння на дзіцяці апраналі кашульку ці кавалак палатна з дзіркай для галавы. Гэта служыла талісманам у далейшым, засцерагала ад падзення з дрэва. Спавівалі дзіця ў пялёнкі, якія дарыла яму хросная маці.

У доме бацькоў першай хросных з хрэснікам сустракала баба-павітуха, апранутая ў аўчынны кажух, вывернуты поўсцю наверх. Яна пыталася, якое імя атрымаў нованароджаны, адносіла дзіця да маці, а сама з гасцямі ішла ў лазню, дзе крапіла ўсіх вадой. Калі да гэтага ў сямейнай пары дзеці паміралі, хрэсніка падавалі праз акно.

Сталы для святочнага абеду ставіліся ў адну лінію, каб жыццё дзіцяці было доўгім і бязбедным. Гасцей рассаджваў гаспадар. Самымі ганаровымі лічыліся баба-павітуха, кум і кума. Іх садзілі ў кут. Колькасць страў была ўнушальнай, але рытуальнай лічылася каша. Яе варыла або баба-павітуха, або кум з кумою.

Кашу падавалі ў канцы абеду, у гліняным гаршку, накрытым талеркай. Талерку здымалі і ў яе клалі хто грошы, хто яйкі – выкуплялі кашу. Сабраны выкуп належаў бабцы-павітусе, але часта яна дзялілася ім з нованароджаным, давала «на мыла». Потым кум павінен быў адным ударам разбіць гаршчок аб стол, «каб шчаслівым рос нованароджаны» і з чарапка даць паспытаць усім кашы. Заканчвалася звычайна застолле тым, што гаспады- ня дарыла хросным пірагі, так звайыя «кумавікі», і ўсе разыходзіліся па дамах.

Збіраліся госці і на другі дзень. Выпівалі, закусвалі ў хаце нованароджанага. У канцы абеду бабку-павітуху закручвалі ў тканіну і спявалі абрада- выя песні:

Дзякуй таму кавалю, а што здзелаў
нам гульню.
Ён і ручачак ні хукаў, малаточкам ня
стукаў.
Бяз молату, бяз кувадла, паглядзі: дзіця
ладна.

***

А ў саду явар зілянюсенькі,
На куце кумок маладзюсінькі.
А ў саду вішня зілянюсінька
На куце кума маладзюсінька.
Над тарой верба сукуватая,
На куце бабка шой гарбатыя.
Йна й гарбатыя, йна й багатыя:
А ў бабы кабат – сто рублей аддат,
А ў кумы каралі – тысічу ўсталі,
А ў кума штаны – ім німа цаны,
Ай, ля варота, дый ўсёй золата.

***

А кум куме рад, павёў куму ў сад,
Пасадзіў куму ў садзе на цвяток:
– Еж, кумка, ягодкі, каторыі салодкі,
Каторы горкі – длі маёй жонкі.

І запрашайця, і запрагайця,
А дзвінаццаць сабак, а дзвінаццаць сабак,
А павязём, а павязём
Мы бабулю ў кабак, мы бабулю ў кабак.
Наша бабуля, наша бабуля
А паязды любя, а паязды любя.
А іна нам, а іна нам

Гарэлачкі купя, гарэлачкі купя.

Потым мужчыны праносілі барану, павернутую зубамі ўверх, садзілі на яе бабку-павітуху і на сабе цягнулі ў карчму. Там працягвалі весяліцца.

*В.Ф.Куліненка.*

# Кірмашы

Кірмашы здаўна лічыліся своеасаблівымі святамі, іх адкрыцця з хвалюючай нецярплівасцю чакалі і дарослыя, і дзеці. Тут не толькі прадавалі і куплялі, а сустракаліся разлучаныя адлегласцю сябры і сяброўкі, заводзілі новыя знаёмствы як людзі пажылыя, так і маладыя. У апошніх тэта нярэдка заканчвалася вяселлем.

Вось як выглядаў у Крычаве кірмаш напярэдадні першай сусветнай вайны, паводле ўспамінаў старажылаў.

Цэлую ноч перад адкрыццём грукочуць на вуліцах цяжка гружаныя фурманкі, рыкаюць каровы, бляюць авечкі, падаюць спалоханы голас куры, парохкваюць у калёсах вепручкі. Едуць з усіх бакоў людзі, імкнуцца раней трапіць на кірмашовы пляц і заняць там зручнае месца.

Ажывае ў такія часіны Крычаў, скідае з сябе зацятую журбу і маўклівасць, прыкметна маладзее, весялее і святлёе ад святочных убораў прыехаўшых, іх гоману, песень, музыкі. Паветра робіцца духмяным ад разнастайных пахаў, спакусліва-смачным, аж хмяліць галаву.

І чаго толькі не папрывозілі людзі на продаж! На лавах ляжыць цыбуля, морква, часнок, буракі, у бочках водарна жаўцее квашаная капуста, абсыпаная калінавымі ягадамі, зелянеюць буйныя, таксама квашана-салёныя памідоры і агуркі, красуецца ганарыста рэпа, рэдзька і капуста ў качанах, тугіх і вялізных. Жаўцее гарох, сінее боб, бурштынава высвечвае пахучы мёд, кліча да сябе масла, свежае і жоўтае, тварог, смятана, курыныя, качыныя і гусіныя яйкі. Чакаюць пакупніка ўсялякіх памераў серабрыстыя шчукі, ляшчы, ментузы, акуні, стаіць у кадушках і рыба дамашняга пасолу, просіцца ў рукі вэнджаная.

Далей ідуць грыбы – марынаваныя, сушаныя. За імі крамяна ўзвышаюцца кавалкі сала, свежага мяса, каўбасы, падсохлыя і пахкія, вэнджаныя кумпякі. Мяса – свіное, качынае, курынае, гусінае, а таксама цяляціна і бараніна. Усяго ў дастатковай колькасці, можна выбіраць не баючыся, што цябе нехта апярэдзіць і перахопіць тавар.

Воддаль ад прадуктовых лавак прадаецца жыўнасць: каровы, коні, свінні, парасяты, авечкі, гусі, куры, качкі, цыляты. Збоку ад іх, на ўтульным грудку выставілі свае вырабы ганчароўскія майстры-саматужнікі. Тут місы розных памераў, гарлачы, гаршкі, збаны, лыжкі. Посуд адменны, аж звініць, калі да яго дакранешся, прадукцыя крычаўлян з Ганчароўкі карыстаецца попытам за межамі мястэчка.

Побач з ганчарных спраў майстрамі сяляне прапаноўваюць пшаніцу, ячмень, авес, жыта, каноплю, бульбу, ільнасемя, гарбузы. Далей гандлююць тканінамі яркіх афарбовак прамысловай вытворчасці і дамаканым адбеленым палатном. Прадаюць і гатовыя вырабы: прыгожа вышытыя ручнікі, кашулі, фартухі, штаны, хусцінкі, кофты, пінжакі і абутак. Багата было на кірмашы тавараў гаспадарчага ўжытку. Зіхоткія ад сонечнага святла косы, сякеры, цвікі, сталярны інструмент, пілы, абцугі і г.д.

Наогул за час работы кірмашу, адведзеная пад яго плошча робіцца як бы маляўнічым паселішчам з вулачкамі і завулкамі. У ім нават падвыпіўшыя мужыкі-вяскоўцы блукалі, не ў стане адшукаць свайго воза і гаспадыню.

Няма сэнсу далей перлічваць тавары, што прапаноўваліся на кірмашы пакупнікам. Іх была процьма і ўсе неблагой якасці. Галоўнае, што тут гаспадарыла весялосць, гучалі жарты, песні, не змаўкала музыка. Чэргіназіраліся толькі за хлебным, сунічным, малінавым і бруснічным квасам, які так хораша бадзёрыў і асвяжаў засмяглае нутро, наталяў смагу і быў надзвычай смачным.

Людзі не толькі набывалі неабходныя сабе рэчы або гандлявалі рознымі таварамі, яны і адпачывалі ў гэтай вясёлай тлумнай мітусні, свяжэлі душой, забываючыся на нейкі час на жыццё- выя нягоды.

Тое, што на кірмашы было шмат усялякіх харчовых тавараў, зусім не сведчыць пра высокі ўзровень жыцця сялянства і рамеснікаў Крычаўшчыны. Для болынасці беднякоў не было штата шляху атрымаць нейкія грошы, так яму патрэбныя, як прадаць што-небудзь. Таму, часта застаючыся самі без запасаў, везлі на кірмаш выгадаванага парсюка, цяля, курэй або гусей, а выручаныя грошы пускалі на гаспадарчыя патрэбы. Іншага выйсця не было. Багацейшыя ж мелі з кірмашовага гандлю немалый прыбыткі і, вывучаючы попыт пакупнікоў, штогод імкнуліся гэтыя прыбыткі памножыць.

Кірмашовыя святы працягваліся некалькі дзён. Добра на іх было не толькі дарослым, але і дзецям. 1х там чакала шмат забаў і ласункаў: цукерачныя і пернікавыя мядзведзі, вавёркі, пеўнікі, прыгожыя цацкі, дудачкі, свісцёлкі і інш.

*В.Ф. Куліненка.*

# Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці раёна

**Народны самадзейны калектыў народнай песні і танца «Вітанне»** пры раённым цэнтры культуры арганізаваны ў 1992 г. Званне народнага было прысвоена ў 1994 г. Мастацкі кіраўнік Я.С. Разікава. Выступленні самадзейных артыстаў слухалі і глядзелі жыхары гарадоў Смаленска, Валгаграда, Волжскага, Мінска, Рэспублікі Малдова. За час свайго існавання ўдзельнікі ансамбля далі болын за 100 канцэртаў. Усіх іх аб’ядноўвае гарачая любоў да песні, да самабытнага народнага танца. У рэпертуары ансамбля беларускія народныя песні, танцы, творы кампазітараў блізкага і далёкага замежжа. Салістамі ансамбля з’яўляюцца Аляксандр Карэцкі, Ала Вінаградава, Сяргей Карнееў, Тамара Дземчанка, Ганна Свадкоўская.

**Узорны дзіцячы фальклорны калектыў «Вашчылкі»** створаныў 1991 г. на базе першай музычнай школы. Звание народнага прысвоена ў 1992 г. Кіраўнік Г.Я. Бацвіннік. У рэпертуары беларускія народныя песні, іх апрацоўкі. Ансамбль прымаў удзел у другім Міжнародным фестывалі «Голас дзяцінства» ў 1992 г. у Мінску, у першым Міжнародным фестывалі-конкурсе дзіцячай творчасці «Музычная вясёлка» ў 2001 г. у Валгаградзе, дзе атрымаў дыплом першай ступені.

**Народны аркестр духавых інструментаў** пры Доме культуры «Цэментнік» свораны ў 1998 г., званне народнага прысвоена ў 2002 г. Кіраўнік А.М. Сурман. Удзельнікі калектыва – рабочыя прадпрыемства, студэнты навучальных устаноў, настаўнікі. У




Народны ансамбль песні і.танца «Вітанне».



Духавы аркестр г. Крычаў.



Хор ветэранаў вайны і працы г. Крычаў.

рэпертуар аркестра ўваходзяць творы розных жанраў: танцавальная музыка, а таксама творы замежных, рускіх і беларускіх аўтараў, уласныя інструментоўкі ўдзельнікаў аркестра. Адзін з асноўных напрамкаў творчасці калектыву – вакальнае выкананне ў суправаджэнні аркестра. Аркестр прымаў удзел у 2001 г. у абласным фестывалі «Па галоўнай вуліцы з аркестрам...», у рэгіянальным аглядзе мастацкай самадзейнасці, выступаў у многіх гарадах рэспублікі.

**Хор ветэранаў.** Сярод самадзейных мастацкіх калектываў раённага цэнтра культуры важнае месца займае хор ветэранаў. У ім удзельнічаюць каля 20 чалавек. Зараз у праграме хору болыл як 30 твораў: старадаўнія песні, беларускія, рускія, украінскія народныя песні, песні сучасных аўтараў.

**Народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Крэчуты».** Створаны



Народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Крэчуты».



«Кубанскія казакі» на мяжы з Расіяй.

ў 1998 г., звание народнага присвоена ў 2001 г. Кіраўнік В.В. Талтонава. У рэпертуар калектыва ўваходзяць беларускія народныя песні розных жанраў: жартоўныя, лірычныя, сямейна-бытавыя, каляндарна-абрадавыя. Творчая біяграфія калектыва батата на падзеі. Ансамбль быў удзельнікам фестывалю славянскай пісьменнасці ў 1999 г. ў Рослаўлі, у 2002 г. стаў лаўрэатам міжнароднага фестывалю «Порубежье», які праходзіў у г. Шумячы Смаленскай вобласці. Часта выступав з канцэртамі перад гараджанамі і вяскоўцамі Крычаўшчыны.

**Народная студыя выяўленчага мастацтва** пры раённым цэнтры культуры створана у 1974 г. А.Р. Герашчанкам. Звание народнай студыя атрымала ў 1998 г. Многія студыйцы сталі прафесійнымі мастакамі. Гэта Аляксандр Фралоў, Сяргей Давідовіч, Уладзіслаў Малахаў, Уладзімір Ерафееў.

У 1982 г. студыю ўзначаліў М.П. Гарбуноў. За час існавання многія ўдзельнікі студыі выяўленчага мастацтва адзначаліся дыпломамі, Ганаровымі граматамі на раённых, абласных і рэспубліканскіх выстаўках. Іх дасягненні адзначаны дыпломам ВДНГ СССР, двойчы дыпломам газеты «Красная звезда», дыпломам Міністэрства культуры СССР, ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры, ЦК прафсаюзаў работнікаў сельскай гаспадаркі і нарыхтовак.

**Народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свістулька».**

Створана пры раённым цэнтры культуры ў 1995 г. Асноўная ўвага ў яе рабоце ўдзяляецца кераміцы, выву-

чэнню традыцый народных промыслаў і рамёстваў, збору этнаграфічнага матэрыялу. І тэта не выпадкова. Крычаў – старажытны цэнтр ганчарства ў нашым краі. Вырабы нашых майстроў былі вядомыя далёка за межамі Беларусі яшчэ у XV–XVII ст. На жаль, старажытнае рамяство з цягам згасла. Студыя «Свістулька» займаецца яго адраджэннем. Тут вырабляюцца традыцыйная падняпроўская і крычаўская гліняныя цацкі. Гэта фігуркі людзей, звяроў, бразготкі, свістулькі. Яны захавалі свой даўні выгляд і форму – стылізаваныя фігуркі конікаў, вершнікаў, розных птушак, баранчыкаў, драконаў і іншае. Кіруе дзіцячай студыяй з дня яе стварэння Вячаслаў Якавенка. Зараз



Сустрэча артыстаў ансамбля.

у калектыве займаецца 40 дзетак узростам ад 9 да 16 гадоў. Аднак у студыю з задавальненнем заглядваюць выпускнікі, бацькі дзяцей, дапамагаюць ім ляпіць ды і самі вучацца. У цяперашні час студыйцы вырабляюць не толькі цацкі, а і ўсялякія сувеніры: падстаўкі для алоўкаў, кнопачніцы, папяльніцы, падсвечнікі... А яшчэ яны адрадзілі традыцыйныя беларускія музычныя інструменты – дудачкі, акарыны, парняты (двайныя дудачкі), навучыліся таксама рабіць сірынгу, вадзяную свісцёлку «Салавейка» і шмат іншага. Напрыклад, адрадзілі такую цацку як «Сыч», або «Філін». Дунеш у яе і пачуеш сапраўднае філінавае «У-у-у-у». У рабоце студыйцы прымяняюць ангоб, паліву, гуаш, засвоілі тэхніку абварнай і задымленай керамікі.

Пачынаючы з 1996 г. калектыў «Свістулькі» бярэ ўдзел у розных раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах: фестывалі аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (в.Вяззе Асіповіцкага раёна), фестывалях «Вечназялёная дрэва рамёстваў» (Мінск) і «Беларусь – мая песня» (Магілёў), Міжнародным дзіцячым фестывалі «Залатая пчолка» (Клімавічы), фестывалі сямейнай творчасці «Сузор’е талентаў» (Глуск), свяце славянскій пісменнасці (Рослаў), «Дажынках-2000» (Шклоў), «Славянскім базары» у Віцебскў, фестывалях, прысвечаных 55-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (Валгаград і Волжск). Вось далёка не ўвесь пералік творчага шляху дзіцячай студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якой у 1999 г. было прысвоена высокие званне народнай.

Работы студыйцаў па кераміцы



Дзіцячы народны калектыў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свістулька».

прымалі ўдзел у выставах у Расіі, Германіі, Нарвегіі, Галандыі, Бельгіі, Малдове, на Украіне.Народны калектыў мае шмат дыпломаў, ганаровых грамат, удзячных лістоў з розных краін свету, Болынасць выхаванцаў маюць таксамі асабістыя ўзнагароды, дыпломы, граматы. У прыватнасці, Кацярына Анішчанка адзначалася ў Беларусі, Расіі, Галандыі, Бельгіі, Чэхіі, Малдове. Пералічыць лепшых проста цяжка. Сярод іх Ірына Каладкова, Каця Гатоўчык, Юля Свецік, Юля Будагоўская, Каця Карнеева, Аня і Вольга Шаўцовы, Дар’я Сапранецкая, Аліна Купцова, Ганна і Алена Чарнавусавы, Андрэй Давыдзенка, Іван Зубко, Арцём Пастрэвіч, Віка і Аксана Быкавы і іншыя.

Кіраўнік студыі В.Якавенка распрацаваў некалькі фальклорна-этнаграфічных і тэатральных кампазіцый – «Крычаўскія ганчары», «Ганчарная майстэрня» і іншыя, сцэнарыі дзіцячых гульняў, напрыклад, «Адгадай цацку па гуку», «Гарлачыкі» і г .д. На 9-м абласным аглядзе-конкурсе прафесійнага майстэрства народных промыслаў і рамёстваў у 2001 г. яго аўтарская праграма заняла першае месца. У 2001 г. В.Якавенку запрашалі ў Каралеўства Нідэрланды. Там ён выступаў з дакладам, чытаў лекцыі, праводзіў гутаркі па культуры, мастацтву і экалогіі Беларусі, даваў урокў жывапісу, кампазіцыі і культуры, Арганізаваў 3 асабістыя і 7 дзіцячых выстаў керамікі і малюнкаў у сталіцы і іншых гарадах Каралеўства.

Народны калектыў «Свістулька» –

з’ява унікальная. Яго выхаванцы не толькі робяць цацкі і музычныя інструменты, але і самі граюць на іх. Яны адраджаюць фальклорную спадчыну нашай Крычаўшчыны.

*С.Д. Дыннікаў.*

Народны ансамбль «Народнай песні, музыкі і танца «Чабарок»

Створаны ў 1995 г. У аматарскім калектыве налічвалалася 14 чалавек. У верасні 2003 г. стаў народным. Першым мастацкім кіраўніком была Л.А. Мазалькова, харэографам – Т.М.Дубяга. Зараз у калектыве 18 чалавек. Ансамбль выконвае беларускія, рускія і украінскія песні. З 1998 г. ансамблем кіруе Т.В.Баранава, харэограф І.М. Вярэніч. Самадзейныя артысты выступалі з канцэртамі ў гарадах Беларусі і Расіі. Удзельнічалі ў конкурсах і фестывалях: «Беларусь – мая песня» (г.Касцюковічы), «Дружба – без мяжы» (Расія), на свяце славянскай пісьменнасці (Расія).

*Г. А. Кірпічова.*

## Чароўныя гукі музыкі

У Крычаве працуюць дзве музычныя школы. Кожная з іх мае па тры філіялы ў буйных вёсках раёна. У 1999 г. у абедзвюх школах навучаліся 544 хлопчыкі і дзяўчынкі. Тут можна пачуць меладычныя галасы скрыпкі, баяна, віяланчэлі, домры, цымбал, балалайку кларнета, трубы, гармоніка,



На занятках у музычнай школе.

флейты і іншых музычных інструментаў. Дзеці не толькі спасцігаюць сакрэты музычнай культуры, але і набытыя ў школе веды дэманструюць Дарослым, выступаючы перад імі з канцэртамі. Удзельнічаюць вучні школ і ў рэспубліканскіх і абласных конкурсах, нярэдка прывозяць адтуль дыпломы за добрае выкананне музычных твораў. Далёка за межамі раёна ведалі ансамбль «Вашчылкі» першай дзіцячай музычнай школы (кіраўнік Г.Я. Бацвіннік). Яго выступленні пакарылі італьянцаў.

Многія выпускнікі школ сталі прафесіянальнымі музыкантамі. А тыя, хто такімі не сталі, захавалі ў душы пяшчотную павагу да музычнай культуры, праніkліся гарачай любоўю да чароўных гукаў, якія цудадзейна ўплываюць на чалавека, лечаць яго ад самоты, уціхамірваюць гнеў, робяць чалавека лепшым.

Вучні абедзвюх музычных школ з удзячнасцю гавораць пра педагогаў Н.Г. Федасенку, С.І. Багданаву, І.А. Трацэўскую, А.Н. Уласаву, С.А. Рыбчынскага і іншых. Педагогі шчодра аддаюць свае веды дзецям, робяць усё неабходнае для таго, каб яны не засталі- ся абыякавымі і чужымі ў свеце чароў- ных гукаў. Многія з іх, а таксама з былых выпускнікоў школы, памятаюць і былога дырэктара школы, Валянціну Артураўну Шуганаву, якая аддала шмат сіл, намаганняў і любві школе, яе педагогам і навучэнцам.

## Далучэнне да прыгожага

Дзіцячая мастацкая школа пачала працаваць з 1 кастрычніка 1977 года. Першым дырэктарам яе быў Анатоль Рыгоравіч Герашчанка, чалавек, да самазабыцця ўлюбёны ў мастацтва.

Сюды ахвотна прыходзяць дзеці на заняткі. З удумлівымі і засяроджанымі тварамі прагна ловяць яны кожнае слова педагогаў, і ў такія часіны чуйная цішыня пануе ў класах. Вучняў школы можна часта ўбачыць на ціхіх, атуленых зелянінай ліп, вішань, сліў вулачках Крычава, або ў іншых маляўнічых мясцінах Прысожжа, дзе яны рупна імкнуцца адлюстраваць на ватманаўскіх лістах навакольную прыгажосць.

Педагагічны калектыў зараз узначальвае Міхаіл Пракопавіч Гарбуноў. Міхаіл Пракопавіч піша карціны, якія вядомы не толькі крычаўлянам, але і жыхарам Магілёва і іншых рэгіёнаў рэспублікі. Плённа аддаюць навучэнцам свае веды М.М. Шарыхіна, В.М. Гарбуноў, Г.В. Саковіч, А.М. Марозава, Т.А. Салаўёва.

Вучні школы пастаянна бяруць удзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. 8 карцін вучняў школы экспануюцца ў міжнародным дзіцячым музеі ў гарадах Осла, Нью-Йорк.

Дзіцячая мастацкая школа ў Крычаве мае 7 сваіх філіялаў на вёсцы. Няхай не ўсе навучэнцы стануць славутымі мастакамі, але ў душы кожнага з іх застанецца след ад далучэння да чароўнага свету мастацтва, яго таямніц. І тэты след будзе дапамагаць заўважаць і цаніць усё прыгожае ў жыцці.

# Музеі раёна

**Крычаўскі краязнаўчы музей.** Заснаваны і адкрыты ў 1961 г. у г.Крычаў на базе экспанатаў, сабраных М.Ф. Мельнікавым. Пл.экспазіцыі 318 $м^2$, болын за 15,4 тыс. экспанатаў асноўнага фонду (1997). Сярод экспанатаў матэрыялы археалагічных раскопак Крычаўскага замка, калекцыі манет часоў ВКЛ, Рэчы Паспалтіай, Расіі, зброі XIV ст., матэрыялы пра Грунвальдскую бітву 1410 г., Паўночную вайну 1700-21 гг., пра Крычаўскае паўстанне 1743 – 44 гг., Крычаўскую суднаверф, пра дзейнасць народнікаў Р.П. Ісаева, С.П. Каваліка, М.К. Судзілоўскага, рэвалюцыянераў У.Дз. Бонч-Бруевіча, П.М. Лепяшынскага, В.А. Радус-Зяньковіча, падзеі рэвалюцыі 1905-1907 гг. Экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, размешчана на пл. 50 $м^2$. Экспануюцца матэрыялы аб пачатковым перыядзе вайны: карта-схема лініі фронту ў раёне Крычава ў ліпені – жніўні 1941г., рэшткі самалёта лётчыка А.В.Гуменнікава, на якім ён здзейсніў паветраны таран над роднай вёскай Бель, схема бою каля в.Сакольнічы, фатаграфіі, дакументы, асабістыя рэчы, зброя ўдзельнікаў баёў на Крычаўшчыне, у т.л. генерал-маёра П.П. Корзуна, камандзіра 20-га стралковага корпуса С.І. Яроміна, артылерыста М.У.Сірацініна і інш.; аб узнікненні і разгортванні



У Крычаўскім краязнаўчым музеі.



Удзельнікі ўсесаюзнага злёту «Арляня» у Крычаўскім краязнаўчым музеі.

падполля і партызанскім руху ў раёне – матэрыялы пра Крычаўскае партыйна-камсамольскае падполле, у т.л. пра ўдзельнікаў гэтага падполля артыстаў А.І. Акаёмава і Г.П. Лузеніна, журналіста А. А. Гардзіевіча, фатаграфія членаў Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б, друкарскі станок, лістоўкі, якія выпускаліся ў 48-м асобным партызанскім атрадзе, выданне «Раздавім фашысцкую гадзіну» за 1942- 43гг., фатаграфіі і дакументы партызан атрада «Анатоля», «Алеся», 3-га, 48-га і інш. Расказваецца аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у раёне. Матэрыялы аб вызваленні горада і раёна, аб 212-й і 385-й стралковых дывізіях і 572-м пушачна-артылерыйскім палку, якія атрымалі ганаровыя найменні «Крычаўскіх», фатаграфіі і асабістыя рэчы воінаў-вызваліцеляў; аб земляках – удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Фатаграфіі, асабістыя рэчы двойчы Героя Савецкага Саюза І.І. Гусакоўскага, Герояў Савецкага Саюза А.Я. Смалякова і М.І. Сталярова, поўнага кавалера ордэна Славы У.Я. Карнеенкі і інш. Экспануюцца карціна «Там, за Сожам Беларусь» (маст. В.Бялоў), бюсты лётчыка А. Гуменнікава (скульпт. С.Адашкевіч) і рэдактара падпольнай газеты «Звязда» і «Чырвоная змена» М.П. Барашкава.

*Н.М. Марозава.*

**Краязнаўчы музей Сакольніцкай сярэдняй школы.** Створаны ў 1991 г. па ініцыятыве піянерважатай К.М. Пузырэўскай і выкладчыцы гісторыі Т.М. Жывіцкай. Разам з вучнямі яны збіралі дадзеныя пра гісторыю сваёй вёскі, славутых землякоў, пра барацьбу крычаўлян з фашысцкімі захопнікамі. Цікавыя экспанаты пра жывёльны і раслінны свет рэгіёна размешчаны ў двух пакоях. Музей наведваюць не толькі школьнікі. Тут часта бываюць





У музеі Сакольнідкай сярэдняй школы.

і дарослыя. Адшукваюцца новыя экспанаты, расшыраецца экспазіцыя. Плённа вядуць у гэтым напрамку работу выкладчыкі гісторыі У.Я. Янкоўскі, С.С. Белавусава.

Пакоі і куткі баявой і працоўнай славы дзейнічаюць у Бацьвінаўскай, Дзягавіцкай, Маляціцкай і іншых школах раёна.

## Хто пабудаваў палац у Маляцічах?

Неяк у адным з старажытных выданняў па гісторыі Магілёўшчыны давялося прачытаць паведамленне аб тым, што ў Маляцічах у канцы XVIII ст. быў пабудаваны палац – у 32 разы паменшаная копія вядомага сабора св. Пятра ў Рыме. Паўтарэнне цуда італьянскай архітэктуры ў беларускай вёсцы! Гэтаму было цяжка паверыць.

І вось у 1959 г. ў Крычаў прыйшло пісьмо з Вільнюса. Яго аўтар, адзін з вядомых літоўскіх архітэктараў і знаўца гісторыі архітэктуры Літвы і Беларусі Э.С. Барэйка прасіў даведацца ў старажылаў Маляцічаў аб копіі сабора св.Пятра.

Потым у Крычаў прыехаў сам Эдуард Сцяпанавіч Барэйка. Ён паказаў нам нумар літоўскага навуковага часопіса з ілюстрацыяй палаца ў Маляцічах. Глядзіш на копію і думает: няўжо ў вёсачцы на Крычаўшчыне быў створаны такі цуд? Пад карцінай надпіс на лацінскай мове: Касцёл Станіслава ў Маляцічах, пабудаваны Станіславам Сестранцэвічам-Богушам. У

левым кутку чытаем: «Напісаў Лаўрэнці Гуцявічус».

Нам і раней было вядома імя Богуша-Сестранцэвіча, кіраўніка каталіцкай царквы ў Расіі пры Кацярыне II. Мы ўжо былі знаёмы з дзённікамі гэтага буйнога феадала. Тэта на суконнай фабрыцы ў Буйнічах, у Магілёўскай друкарні, у вёсках Маляцічы, Баеўка, Добрае, Сарочын, Мышкавічы тысячы беларусаў гнулі спіны на Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. У сваіх дзённіках ён піша толькі аб колькасці сукна, аб купленых вінах, аб пакаранні сялян, аб гандлёвых справах сваіх вотчын. Сасланы імператрыцай Кацярынай II на Магілёўшчыну, ён жыў у Буйнічах і Маляцічах. У Маляцічах у яго быў палац і касцёл Св. Станіслава, сажалкі, поўныя рыбы, засекі хлеба, бочкі мёду.

Імя Сестранцэвіча знаёма. А вось імя архітэктара Лаўрэнція Гуцявічуса толькі ўпамінаецца ў Вялікай Савецкай энцыклапедыі. Эдуард Сцяпанавіч Барэйка, вялікі знаўца творчасці Гуцявічуса, расказваў многа цікавага.

У 1753 г. ў сям'і прыгоннага селяніна Сіманаса Стуока нарадзіўся сын. Ён рана праявіў вялікія здольнасці да малявання. Хлопчыка ўдалося ўладкаваць у школу ў горадзе Палявене, потым у Панявежыс. У 1773 г. Лаўрэнцій ужо ў Вільні. Ён вучыўся ў манастырскай школе, потым у Віленскім універсітэце.

Вядома, Лаўрэнцій не быў нашчадкам нейкага Гуцявічуса. Проста яго сябры склалі такую біяграфію дзеля таго, каб выключна таленавіты юнак дабіўся ажыццяўлення запаветнай мары і стаў дойлідам. Поспехі юнака здзівілі прафесара, і сын прыгоннага ў 1777 г. атрымаў права на творчую паездку ў Парыж і Рым. Там ён пазнаёміўся з творчасцю вялікіх архітэктараў Еўропы.

Вярнуўшыся ў Літву, малады архітэктар стварыў шэраг цудоўных будынкаў: Віленская ратуша, Вяркайскі палац і іншыя.

Сын прыгоннага літоўскага селяніна, горадабудаўнік Літвы і Беларусі, Лаўрэнцій Стуока-Гуцявічус бываў у нашых краях, дзе таленавітыя майстры-будаўнікі пад кіраўніцтвам архітэктара стварылі здзіўляючы па прыгажосці будынак. Касцёл быў пабудаваны ў 1974 г.

*М. Ф. Мельнікаў.*

# Свята вуліц

Традыцыя ў Крычаве – праводзіць свята вуліц. Карысць ад такога мерапрыемства відавочная. Бо вуліца, рыхтуючыся да ўрачыстасці, непазнавальна мяняе свой выгляд. На ёй не ўбачыш ні смецця, ні дзядоўніку і іншага пустазелля.

Так, напярэдадні 200-годдзя з дня нараджэння рускага паэта А.С.Пушкіна было праведзена свята Пушкінскай вуліцы і завулка імя Пушкіна. Ветэранам вайны і працы, якія пражываюць на гэтых вуліцы і завулку, былі ўручаны сувеніры і грашовыя ўзнагароды, для кожнага з іх самадзейныя спевакі выконвалі песні. Адзнакі павагі былі выказаны М.П.Кавалёву, М.Ф. Чубараву, Е.С. Бугаёвай, У.П. Турчыну, Т.П. Кавалёвай за іх ваенны і працоўны гераізм.

Таццяна Паўлаўна Кавалёва, хата якой першай з'явілася на Пушкінскай вуліцы ў 1946 годзе, расказала аб цяжкасцях пасляваеннага жыцця і гісторыі ўзнікнення завулка і вуліцы. Яе ўспаміны прысутныя з цікавасцю пас-



М.Ц. Ганчурына з калгаса «Запаветы Ільіча».



К.А. Леўдзікава з в. Зарубец, 100 год.

лухалі. Прысутнічалі на свяце і самыя старэйшыя жыхары гэтых мясцін. Гэта Алена Мікалаеўна Гарбатоўская, якой споўнілася 100 гадоў, і трохі маладзейшыя за яе Настасся Маркаўна Клімянкова і Вольга Васілеўна Зімкова. Ім былі ўручаны сувеніры.

Адзначаны на свяце былі і сямейныя пары, якія ў згодзе пражылі 50 і болын гадоў, падарункамі і сувенірамі. Іх атрымалі сем'і Чубаравых і Сіраковых. Самай шматдзетнай на вуліцы і завулку аказалася сям'я Краўцовых. Яны гадуюць 5 сыноў і дачок. Ім таксама ўручаны памятныя падарункі.

Людміла і Міхаіл Сырнікавы ў свой адрас выслухалі словы пахвалы. Дом іх быў прызнаны самым акуратным і рупна дагледжаным. Дбайныя гаспадары атрымалі ўзнагароду за чысціню і ўзорны парадак.

Займальна і весела прайшло свята. Цікавасць выклікала імправізаваная выстава вырабаў з саломкі, гліны, нітак, самаробныя дываны і ручнікі з адмысловай вышыўкай і іншыя ўзоры народнай творчасці. Іх дэманстравалі таленавітыя умельцы, што жывуць на Пушкінскай вуліцы і завулку Пушкіна.

Не сумавалі на ўрачыстасці дзеці. Для іх правялі конкурс на лепшы малюнак на асфальце. Тэмамі малюнкаў сталі героі неўміручых казак А.С. Пушкіна. Ахвотнікаў паказаць сваё майстэрства аказалася шмат, бо пераможцаў чакалі салодкія пачастункі.

Святы вуліц праходзяць у шматлікіх вёсках. Як правіла, запрашаюць на іх паважаных старажылаў, знакамітых людзей.

# Помнікі гісторыі і архітэктуры Крычаўскага раёна

**Г.КРЫЧАЎ**

**Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных.** Вул. Камуністычная, у скверы, каля будынка клуба цэментна-шыфернага камбіната. Пахаваны ваеннапалонныя, загубленыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941–1943 гг. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптурныя выявы воіна і партызанкі.

**Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных.** Вул. Працоўная. Пахаваны вязні Крычаўскага лагера ваеннапалонных, закатаваныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941 –1943 гг. Колькасць пахаваных не ўстаноўлена. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік - скульптура жанчыны ў жалобе.

**Брацкая магіла савецкіх ваеннапалонных.** Вул. Ціміразева. Пахавана болын за 30 вязняў Крычаўскага лагера ваеннапалонных, якіх у 1941–1943 гг. загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі. У 1959 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура жанчыны са сцягам.

**Брацкія магілы савецкіх воінаў.** Вул. Набярэжная, на Забялышынскіх могілках. У 2 магілах пахаваны воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. і ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных – воіны 4-га паветрана-дэсантнага корпуса. У 1947 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** Вул. Сірацініна, каля будынка райваенкамата. Пахаваны 40 воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ў 1944 г. ад ран. Сярод пахаваных – М.У. Сірацінін. У 1951 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і ахвяр фашызму.** Каля чыгуначнай станцыі Крычаў. Пахаваны воіны і мірныя грамадзяне, якія загінулі 5.07.1944 г. ў час налёту фашысцкай авіяцыі на чыгуначную станцыю. У 1960 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і ваеннапалонных.** Вул. Фрунзе. Пахаваны ваеннапалонныя (колькасць не ўстаноўлена), якія загінулі ў лагеры, створаным у 1941 г. гітлераўцамі на тэрыторыі былога цэментнага завода, а таксама 15 воінаў што загінулі ў час вызвалення Крычава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у канцы верасня 1943 г. У 1967 г. на магіле пастаўлена стала і скульптура воіна.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў, падпольшчыкаў, ваеннапалонных і ахвяр фашызму.** У скверы «60 гадоў Кастрычніка». Пахавана болын за 50 воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў а таксама падпольшчыкаў, ваеннапалонных і мірных жыхароў, загубленых гітлераўцамі ў час акупацыі горада.

**Курган Славы.** У мікрараёне Сож, каля будынка хлебазавода. Насыпаны у 1968 г., з нагоды 50-годдзя БССР і на ўшанаванне памяці больш як 2 тыс. землякоў што загінулі ў барацьбе за ўстанаўленне Савецкай улады, а таксама ў грамадзянскую і Вялікую Айчынную войнах. На вяршыні Кургана ўстаноўлены абеліск. У яго падножжы замураваны спісы загінуўшых і пісьмо нашчадкам.

**Магілы савецкіх ваеннапалонных.** Вул. Заводская, каля адміністрацыйнага будынка цэментна-шыфернага камбіната. У 3 магілах пахаваны вязні (колькасць не ўстаноўлена) Крычаўскага лагера ваеннапалонных, закатаваныяу 1941–1943 гг. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1967 г. на магілах пастаўлены абеліскі.

**Мемарыяльная дошка савецкім воінам-вызваліцелям.** Вул. Ленінская, 25, на будынку кінатэатра «Радзіма». Устаноўлена ў 1960 г.

У ходзе летне-асенніх аперацый 1943 г. войскі 10-й і 50-й армій выйшлі ў канцы верасня 1943 г. на рубеж р.Сож каля Крычава. У ноч з 29 на 30 верасня 1943 г. вайсковыя падраздзяленні 369-й Карачаўскай стралковай дывізіі фарсіравалі Сож паблізу вёсак Прудок і Каменка. Амаль адначасова воіны 212-й і 385-й стралковых дывізій пры падтрымцы 572-га артылерыйскага палка фарсіравалі Сож на поўнач ад Крычава, авалодалі чыгуначнай станцыяй і з боку в.Варанёва атакавалі горад. 30.09.1943 г. Крычаў быў поўнасцю вызвалены ад нямец-

ка-фашысцкіх захопнікаў. У баях за вызваленне горада ўдзельнічалі партызаны 13-й Касцюковіцкай брыгады (камандзір С.А. Мазур, камісар Дз.Я. Савельеў).

**Мемарыяльная дошка Талкачовай Марыі Сяргееўне.** Вул. Талкачовай, 22. Устаноўлена у 1973 г. на доме, дзе падпольшчыца жыла ў Вялікую Айчынную вайну.

**Мемарыяльная дошка ў гонар 50-годдзя заснавання цэментна-шыфернага камбіната.** Вул. Зялёная, на адміністрацыйным будынку камбіната. Устаноўлена ў 1980 г. у памяць аб закладцы 1.5.1930 г. першага каменя на будаўніцтве цэментнага завода (з 1957 г. цэментна-шыферны камбінат). Першую прадукцыю даў 10.11.1933 г.

**Мемарыяльная дошка ў гонар вызвалення горада.** Вул. Ленінская, на будынку дзіцячага сада №1. Устаноўлена ў 1980 г.

30.9.1943 г. часці 10-й арміі Заходняга і 50-й арміі Бранскага франтоў вызвалілі горад ад нямецка-фашысцкіхзахопнікаў. Баец 369-й стралковай дывізіі А. Бязроднаў узняў над будынкам сучаснага дзіцячага сада чырвоны сцяг.

**Месца антыфеадальнага паўстання XVIII ст.** У Крычаўскім старостве ў 1743–1744 гг. адбылося буйнейшае на Беларусі антыфеадальнае ўзброенае выступленне сялян.

**Свята-Мікалаеўская царква.** Вул. Сожавая, 45, на высокім левым беразе р. Сож. Пабудавана ў канцы XIX – пачатку XX ст. з дрэва. Кампазіцыя трохзрубная. Выцягнуты прамавугольны ў плане асноўны зруб накрыты двухсхільным дахам з залобкамі на тарцах. Над вільчаком узвышаецца двух’ярусная вежачка з галоўкай. Да асноўнага зруба прылягаюць роўны з ім па вышыні невялікі прамавугольны бабінец і больш нізкая пяцігранная алтарная апсіда. З паўднёвага боку прыбудавана рызніца, з паўночнага – тамбур дадатковага ўваходу. У дэкоры фасадаў выкарыстаныя ліштвы, гарызантальная шалёўка з вылучэннем цокальнай часткі і фрыза. Інтэр’ер зальны, столь плоская, падшыўная.

Царква – помнік драўлянага дойлідства.

**Палац.** Вул.Ленінская, 59. Пабудаваны у 1778–1787 гг. з цэглы для князя Р.А. Пацёмкіна. У сярэдзіне XIX ст. рэканструяваны.

Палац – двухпавярховы п-падобны ў плане будынак з цэнтральным рызалітам на галоўным фасадзе. У цэнтры абодвух паверхаў вялікія круглыя залы. З-за асноўнага аб’ёму будынка ў бок двара выступае паўкруглы эркер. Галоўны фасад фланкіраваны гранёнымі пілонамі, якія завершаны зубцамі. Вокны цэнтральнага рызаліту стральчатыя, бакавых фасадаў – з стральчатымі сандрыкамі. Планіроўка анфіладная (зменена у 1950-я гады). На 1-м паверсе па цэнтральнай восі знаходзілася парадная трупа памяшканняў: вестыбюль з лесвіцай і авальная зала. Памяшканні мелі багаты ляпны дэкор, кафляныя печы.

Каля палаца пейзажны парк (зберагліся асобныя дрэвы). За палацам размешчаны п-падобны ў плане будынак стайні, фасады якой апрацаваны аркатурай, і пладовы сад з фрагментамі пасадак ліп.

Палац – помнік архітэктуры класіцызму з пазнейшымі напластаваннямі элементаў псеўдагатычнага стылю.

**Паштовая станцыя.** Вул. Ленінская, 76. Пабудавана ў сярэдзіне XIX ст. Абслугоўвала паштовую дарогу Масква – Брэст – Варшава. Цяпер тут база дарожна-эксплуатацыйнай службы.

Станцыя – комплекс будынкаў, размешчаных вакол прамавугольнагаў плане двара. Галоўны будынак мураваны, прамавугольны ў плане, аднапавярховы, з дваровай і пазнейшай тарцовай прыбудовамі. Павернуты галоўным фасадам да дарогі, яго цэнтральная частка і вуглы вылучаны пілястрамі з гатьганымі арачнымі нішамі. Прамавугольныя вокны ў ліштвах з прафіляванымі сандрыкамі ў выглядзе стральчатых арак. Планіроўка будынка сіметрычная. Сцены памяшканняў аперазаны прафіляванымі карнізамі.

Паштовая станцыя – помнік неагатычнай архітэктуры.

**Помнік падпольшчыкам.** Вул. Зялёная. Побач з адміністрацыйным будынкам цэментна-шыфернага камбіната.

У Вялікую Айчынную вайну ў акупаваным нямецка-фашысцкімі захопнікамі пасёлку былога цэментнага завода дзейнічала падпольная група, якую ўзначальваў даваенны сакратар камітэта камсамола завода А.Л. Гаўрыленка.

У 1980 г. у памяць аб дзейнасці падпольнай трупы ўстаноўлена стала.

**Помнік савецкім ваеннапалонным.** На вул. Фрунзе, у пасёлку цэментна-шыфернага камбіната.

У 1941 г. на тэрыторыі цэментнага завода нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі лагер для ваеннапалонных. Тэрыторыя лагера была абнесена калючым дротам у 3 рады, узмоцнена ахоўвалася. Вязні размяшчаліся ў драўляных бараках без даху, на цэментнай падлозе. Ад голаду і хвароб тут штосуткі памірала 60 –70 чалавек. Фашысты катавалі, расстрэльвалі палонных. Да верасня 1943 г. у лагеры загінула больш за 18 тыс. чалавек.

У 1981 г. наўшанаванне памяці ваеннапалонных пастаўлены помнік – мемарыяльная сцяна, да якой прымацаваны 2 дошкі з надпісамі-прысвячэннямі. Побач, на пастаменце, валун з рэльефнай выявай рукі вязня лагера, што разрывае калючы дрот.

**Помнік у гонар абаронцаў горада.** За 1,5 км на ўсход ад горада, каля аўтамабільнай дарогі Крычаў – Рослаў. У 1960 г. ўстаноўлена стала.

**Радзіма Кісялёва Мацвея Сямёнавіча,** героя грамадзянскай вайны.

**Радзіма Мазалькова Яўгена Сямёнавіча,** перакладчыка, крытыка і літаратуразнаўца.

**Радзіма Смалякова Абрама Яўхімавіча,** Героя Савецкага Саюза.

## БАЦЬВІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА АСАВЕЦ

**Помнік землякам.** У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Перамога». На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура жанчыны і параненага воіна.

### ВЁСКА БАЦЬВІНАЎКА

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** Каля клуба. Пахаваны 11 воінаў якія загінулі ў верасні – кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі, што размяшчаўся ў пачатку 1944 г. у вёсды. Сярод пахаваных – воіны 385-й стралковай дывізіі. У 1968 г. намагіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

### ВЁСКА ГУБЕНШЧЫНА

**Помнік землякам.** На могілках. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1978 г. пастаўлены абеліск.

### ВЁСКА КАНЦЫ

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** На могілках. Пахаваны 11 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ці памерлі ад ран у шпіталі. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

### ВЁСКА СЫЧЫК

**Помнік землякам.** У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 112 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна.

## КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА ВОЛЧАС

**Помнік землякам.** У парку. На ўшанаванне памяці 115 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1980 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з дзіцем.

### ВЁСКА КАМАРОЎКА

**Помнік землякам.** Наўшанаванне памяці 146 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1984 г. пастаўлены помнік – скульптурный выявы 2 жанчын у жалобе.

### ВЁСКА КАСЦЮШКАВІЧЫ

**Помнік землякам.** У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса «Памяць Леніна». На ўшанаванне памяці 165 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна.

**Помнік першым калгаснікам-трактарыстам.** Каля будынка праўлення калгаса «Памяць Леніна». У 1981 г. у сувязі з 50-годдзем гаспадаркі і ў гонар першых трактарыстаў калгаса ўстаноўлены трактар «Універсал» на пастаменце.

**ВЁСКА САКОЛЬНІЧЫ.**

**Помнік савецкаму воіну Сірацініну Мікалаю Уладзіміравічу.** За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля дарогі Чэрыкаў–Крычаў.

**Помнік савецкай разведчыды Гіндзінай Таццяне Міхайлаўне і землякам.** Каля будынка праўлення калгаса «Запаветы Ільіча».

Савецкая разведчыца Т.М. Гіндзіна нарадзілася ў 1916 г. у в. Барысавічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям’і. Член КПСС з 1937 г. У 1935 г. скончыла курсы трактарыстаў. Першая жанчына-трактарыст у раёне, брыгадзір трактарнай брыгады Крычаўскай МТС, з 1938 г. старшыня Сакольніцкага сельсавета, з 1939 г. інструктар Крычаўскага раённага выканкома па калгасным будаўніцтве. У Вялікую Айчынную вайну доораахвотна пайшлаў Чырвоную армію. Скончыла спецшколу. Восенню 1942 г. накіравана ў тыл ворага, намеснік камандзіра разведвальна-дыверсійнай трупы. У лістападзе 1942 г. трупа была выяўлена ворагамі. Т.М. Гіндзіна прыкрывала адыход разведчыкаў была цяжка паранена і захоплена ў палон. 19.11.1942 г. расстраляна фашыстамі ў г. Чэрыкаў. Яе імем названа вуліца ў Крычаве.

У 1976 г. на ўшанаванне памяці Т.М. Гіндзінай установлены бюст, побач – стэла з імёнамі 135 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

**ВЁСКА СВАДКАВІЧЫ**

**Радзіма Каваліка Сяргея Піліпавіча,** аднаго з кіраўнікоў народніцкага руху 1870-х гадоў.

## ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ ВЁСКАБЕЛЬ

**Помнік на магіле Гуменнікава Аляксандра Васілевіча.** Савецкі лётчык малодшы лейтэнант А.В. Гуменнікаў (1916 года нараджэння) загінуў 13.07.1941 г. у паветраным баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў над роднай вёскай. Яго імем названа вуліца ў Крычаве.

**ВЁСКА ІВАНАЎКА**

**Помнік землякам.** Каля Дома культуры. На ўшанаванне памяці 131 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайру, у 1984 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з вінтоўкай, абапал – дошкі з імёнамі загінуўшых. Запалены Вечны агонь.

**ВЁСКА ЛАБКОВІЧЫ**

**Помнік землякам.** Каля будынка праўлення калгаса імя Карла Маркса. На ўшанаванне памяці 384 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1982 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна, абапал яе дошкі з імёнамі загінуўшых.

**Радзіма дзяржаўнага дзеяча БССР Кісялёва Кузьмы Венядзіктавіча.**

**ВЁСКА ПАЛАНІЦА**

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** У цэнтры вёскі. Пахаваны 93 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Лабковіцкага сельсавета ў 1941 і 1943 гг. ці памерлі ад ран у шпіталі. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

## МАЛЯЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

**ВЁСКА ЛУТЫ**

**Помнік землякам.** Каля будынка праўлення калгаса. На ўшанаванне памяці 155 землякоў якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. пастаўлены помнік – скульптурная кампазіцыя: жанчына з хлопчыкам.

**ВЁСКА МАЛЯЦІЧЫ**

**Помнік землякам.** У скверы. Наўшанаванне памяці 330 землякоў з вёсак Маляціцкага сельсавета, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. пастаўлены помнік – скульптура воіна з дзіцем. Побач дошка з імёнамі загінуўшых.

## ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**ВЁСКА ЗАРУБЕЦ**

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** На мотілках. Пахаваны воіны Ленінградскага ка-

муністычнага батальёна і Тамбоўскіх камуністычных рот, якія загінулі ў абарончых баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1941 г. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

### ВЁСКА ДЗЯГАВІЧЫ

**Помнік землякам.** Каля будынка канторы саўгаса «Дзягавічы». Наўшанаванне памяці 220 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1982 г. пастаўлены абеліск.

### ВЁСКА ПРУДОК

**Помнік на месцы загубы савецкіх ваеннапалонных, падпольшчыкаў, мірных жыхароў.**

За 0,3 км на паўночны захад ад вёскі. Тут у гады акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі праводзілі масавыя расстрэлы савецкіх грамадзян. 15.02.1943 г. яны расстралялі 280 ваеннапалонных з Крычаўскага лагера, 21.02.1943 г. – удзельнікаў Крычаўскага падполля спевака А.І. Акаёмава і галоўнага дырыжора Маскоўскай абласной філармоніі Г.Н.Лузеніна. За час акупацыі гітлераўцы загубілі тут больш за 1200 чалавек - жанчын, старых, дзяцей.

У 1982 г. на месцы загубы пастаўлены помнік – двухфігурная скульптурная кампазіцыя (скульпт. Э.Астаф’еў, арх. Ю.Казакоў) і мемарыяльны знак. Запалены Вечны агонь.

### ПАСЁЛАК ЧЫРВОНЫ БОР

**Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.** У цэнтры пасёлка. Пахаваны 15 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941–1943 гг. Сярод пахаваных – воіны 1270-га стралковага палка 385-й стралковай дывізіі. У 1967 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна з лаўравым вянком.

### ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ БУДА

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** На могілках. Пахаваны 4 воіны, якія загінулі ў ліпені 1941 г. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Брацкая магіла савецкіх воінаў.** На могілках. Пахаваны воіны, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1985 г. на магіле пастаўлены абеліск.

**Помнік землякам.** Каля будынка канторы саўгаса «Крычаўскі». На ўшанаванне памяці 396 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. пастаўлены абеліск.

**Помнік падпольнчыкам.** У цэнтры вёскі, злева ад шашы Крычаў–Рослаў. У студзені 1942 г. у в. Міхеевічы Чырванабудскага сельсавета была створана падпольная група, якую ўзначаліў камсамолец А.М. Крупадзёраў. У групу ўваходзілі камуніст А.М. Штолік, камсамольцы У.І. Абабкін, В.С. Берахаў І.П. Брыкаў, А.С. Віцюгоў, Р.Л. Нікалайчанка (Нікалайкаў). Падпольшчыкі збіралі зброю і перапраўлялі яе на месца базіравання 48-га асобнага партызанскага атрада, распаўсюджвалі сярод насельніцтва зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі. Патрыёты падарвалі варожы поезд з 2 платформамі, вывелі са строю поезд з майстэрнямі па рамонту пуцей, чыгуначнае палатно на лініі Крычаў – Клімавічы, пашкодзілі мост Маскоўскай шашы. 29 – 30.07.1943 г. падпольнчыкі былі арыштаваны (пазбег арышту толькі А.М. Штолік) і загінулі ў фашысцкіх засценках.

У 1979 г. у памяць аб дзейнасці падпольнай групы пастаўлена стэла з выявамі полымя і мяча, на дошцы – надпіс-прысвячэнне.

*Паводле кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., С. 272—283. Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга. Мн., С. 452-454.*

Падрыхтавала да друку
*З.Г. Дзямешка.*

# З гісторыі населеных пунктаў

## Г. КРЫЧАЎ

Крычаў, горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл., нар.Сож. За 104 км ад Магілёва. Вузел чыгунак на Оршу, Магілёў, Унечу і Рослаў, на аўтадарозе Бабруйск – Масква. 31,1 тыс. ж. (2004).

Упершыню згадваецца ў 1136 г. ва Устаўнай грамаце смаленскага князя Расціслава Мсціславіча пад назвай Крэчут. Старажытным цэнтрам Крычава быў Крычаўскі замак. У XIV–XVIII ст. існавалі Крычаўскія ўмацаванні. У XII – XIII ст. у Смаленскім, з 1-й паловы XIV ст. ў Мсціслаўскім княствах, з 2-й паловы XIV ст. ў ВКЛ. З канца XV ст. цэнтр Крычаўскай воласці, уладанне вялікага князя ВКЛ, кіраваўся яго намеснікамі. З сярэдзіны XVI ст. ў Мсціслаўскім ваяводстве. Пад 1592 г. упамінаецца ў Баркулабаўскім летапісе. 23.8.1653 г. атрымаў магдэбургскае права і герб (у чырвоным полі выява залатога крыжа і сярэбранага мяча). З XVII ст. Крычаў – цэнтр Крычаўскага староства, уладанне Радзівілаў. У Паўночную вайну 1700–1721 гг. летам 1708 г. пад Крычавам быў лагер расійскіх войск на чале з Пятром І. У час Крычаўскага паўстан- ня 1743–1744 гг. у студзені 1744 г. каля Крычава адбыўся бой паміж сялянамі і шляхецкім войскам. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Крычаўу Расійскай імперыі, мястэчка ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У студзені 1776 г. Кацярына ІІ падаравала Крычаўскае староства (14 247 чал.) графу Р.А.Пацёмкіну. У 1779 г. у Крычаве 1594 жыхароў, 470 двароў. У канцы XVIII ст. ў Крычаве дзейнічалі Крычаўская суднаверф, Крычаўскія мануфактуры, а таксама вінакурны, цагельны, шкляны, гар- барны, медналіцейны заводы, млыны. У 1847 г. у Крычаве 630 двароў, 6 цэркваў, касцёл, малітоўная школа, праводзіліся 3 кірмашы на год. У 1897 г. мястэчка, цэнтр воласці, 6221 жыхар, 972 двары, 3 гарбарныя і мылаварны заводы, 4 крупадзёркі, 4 маслабойні,
2 народных вучылішчы, паштова-тэлеграфная кантора, хлебазапасны магазін, 125 крам,
7 цэркваў, касцёл, 5 сінагог, 5 заезных дамоў, 4 кірмашы на год. 3 мая 1919 г. у складзе Гомельскай губерні РСФСР, з 20.8.1924 г. у БССР, цэнтр Крычаўскага раёна Калінінскай, з чэрвеня 1927 г. Магілёўскай акруг, з лютага 1938 г. у Магілёўскай вобл. З 17.12.1931 г. – горад. З 17.7.1941 г. да
30.9.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія загубілі ў горадзе і раёне каля 24 тыс. чалавек. Дзейнічала Крычаўскае патрыятычнае падполле. У 1962 – 1965 гг. у Мсціслаўскім раёне. У 1972 г. – 26,5 тыс. жыхароў. У 2003 г. 28,5 тыс. жыхароў

Прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў («Крычаўцэментнашыфер», завод жалезабетонных вырабаў), Крычаўскі завод гумавых вырабаў, мэблевая фабрыка, мясакамбінат, маслазавод, хлебазавод і інш. Крычаўскі краязнаўчы музей. Брацкія магілы савецкіх воінаў, ваеннапалонных і ахвяр фашызму, курган Славы. Помнікі архітэктуры: Крычаўскі палац (1778–1787), паштовая станцыя (XIX ст.), Мікалаеўская царква (канец XIX – пачатак XX ст.). Збярогся звон, адліты ў 1748 г. для царквы Параскевы Пятніцы. Помнікі археалогіі: гарадзішчы Гарадзец (ранняга жалезнага веку, V– VII ст. і эпохі Кіеўскай Русі) і Замкавая гара (эпохі Кіеўскай Русі).

## БАЦЬВІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

**АСАВЕЦ,** вёска, цэнтр калгаса «Перамога», за 29 км на паўночны захад ад Крычава, 75 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавецналініі Крычаў – Магілёў.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 46 двароў, 202 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. вёска і фальварак у складзе маёнтка Верхаўцы, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У1926 г. – 57 двароў 394 жыхары. У 1928 г. для школы, якая дзейнічала ў вёсцы, пабудавана новае памяшканне. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога», які з 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС, у 1932 г. аб’ядноўваў 47 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Непада-

лёку ад вёскі на участку чыіункі Верамейкі – Асавец партызаны 12.09.1943г. пусцілі пад адхон варожы эшалон, у выніку чаго быў разбіты паравоз, 17 вагонаў і платформаў з аўтамабілямі і іншай тэхнікай. На 1.1.2003 г. 85 двароў 225 жыхароў.

**БАЕЎКА,** вёска, за 22 км на паўночны захад ад Крычава, 82 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў – Магілёў. Праз вёску цячэ р. Мяртвіца (прыток р.Чорная Натапа).

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. як вёска ў складзе маёнтка Маляцічы Мсціслаўскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1737 г. дзейнічала царква. У 1772 г. сяло, 9 двароў, 36 жыхароў, у складзе Расіі, у Мсціслаўскім ваяводстве. У 1780 г. сяло (8 двароў, 116 жыхароў) і вёска (26 двароў, 194 жыхары) у Чэрыкаўскім павеце. У 1834 г. вёскі Баеўка-1 і Баеўка-2, 429 жыхароў. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1860 г. меў 238,5 дзесяціны зямлі. У 1897 г. сяло, у склад якога ўвайшла вёска, 109 двароў, 715 жыхароў, 1 аднайменны фальварак, 2 двары, 9 жыхароў, у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1905 г. пра- цавала казённая вінная лаўка. У 1912 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у вясковай працоўнай школе 1-й ступені, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было 85 вучняў. Школу наведвалі дзеці з вёсак Баеўка, Баранец, Асавец, пасёлкаў Езуфоўка, Высокае і навакольных хутароў. Меліся хата-чытальня, а затым Народны дом, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. Працавалі кузня і млын. У 1926 г. 177 двароў 892 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгасы «Краі- на Саветаў», «Чырвоны Кастрычнік», меліся кузня і ваўначоска. У верасні 1943 г. фашисты спалілі 67 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана і з 1959 г. знаходзіцца ў складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 26 дварою 65 жыхароў.

**БАЦЬВІНАЎКА,** вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Звязда», за 18 км на захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 1 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

На паўднёвым захадзе ад вёскі, на левым і правым берагах р. Жукаўка, захаваліся 3 курганныя могільнікі, якія сведчаць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па рукапісных крыніцах вядома 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 30-я гады XVIII ст. дзейнічала царква. У 1780 г. сяло ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Тут мелася 9955 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, смалакурна-шкіпінарны завод, 2 карчмы. У 1885г. 21 двор, 147 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. сяло, 39 двароў, 255 жыхароў карчма, царква, адзін раз у год – 9 мая – праводзіўся кірмаш. Фальварак Бацьвінаўка (ён жа Галынка), 1 двор, 10 жыхароў 1 хутар Бацьвінаўка, 10 двароў, 75 жыхароў. У 1906 г. адкрыта школа ў наёмным памяш- канні. У 1917 г. 67 двароў 400 жыхароў. З 1212 га зямлі, якія былі ў вёсцы, 696 га належала 6 мясцовым багацеям, памешчыку і царкве.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. Жыхар вёскі Я.Я. Ісачкін быў выбраны старшынёй сельсавета. У грамадзянскай вайне ўдзельнічала больш за 20 вяскоўцаў 2 з іх загінулі. На 1925 г. у Бацьвінаўскім сельсавете 2 хаты-чытальні, 5 школ, 3 кузні. У 1925 г. у працоўнай школе 1-й ступені, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было 54 вучні. Дзейнічала школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, 1 хата-чытальня. У 1926 г. 113 двароў, 586 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгасы «Зара» і імя К.Я.Варашылава, якія ў 1932 г. аб'ядналіся ў адзін калгас «Маяк». Дзейнічала амбулаторыя. У 1936 г. пабудаваны сельмаг. У 1938 г. пачатковая школа пераўтворана ў сямігадовую. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У вёсцы дзейнічала падпольная трупа, якую ўзначальваў Б.Я. Грыгор'еў. У 1946 г. сямігадовая школа пераўтворана ў сярэднюю.

З 1950 г. вёска – цэнтр калгаса імя Леніна. У1954 г. да яго далучана гаспадарка «Барацьбіт». «Звязда» – такая назва мясцовага калгаса зараз. На 1.1.2003 г. 125 двароў, 373 жыхары.

**БРАНСК,** вёска, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцый Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў кал гас. У 1940 г. 27 двароў, 135 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваананямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 4 двары, 8 жыхароў.

**ВАРОДЗЬКАЎ-1** , вёска, за 25 км на паўночы захад ад Крычава. 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Магілёў–Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1653 г. маёнтак Вародзькава Мсціслаў- скага ваяводства. У 1684 г. сяло, дзейнічаў млын на р. Воўчас. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1844 г. пабудавана драўляная царква. Па- мешчык меў тут у 1845 г. 212 дзесяцін зямлі. У 1846 г. 10 двароў, 71 жыхар, у складзе аднайменнага маёнтка Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, дзяржаўная ўласнасць. У 1858 г. 17 двароў 85 жыхароў. У 1862 г. сяляне правялі масавую высечку памешчыцкага лесу. У1897 г. у сяле 6 двароў, 30 жыхароў у вёсцы Вародзькаў-1 31 двор, 190 жыхароў. Побач быў таксама фальварак Вародзькаў

У 1899 г. адкрыта школа, адно памяшканне для якой пабудавана ў 1899 г., другое – у 1910 г. У школеў 1902 г. навучаліся 74 хлопчыкі і 16 дзяўчынак. У 1926 г. 46 двароў, 246 жыхароў. У1930 г. арганізаваны калгас «На варце», мелася кузня. 26.07.1934 г. выязная рэдакцыя палітаддзельскай газеты Крычаўскай МТС і рэдакцыя калгаснай насценнай газеты выпусцілі друкарскім спосабам аб'яднаны нумар газеты, чым быў пакладзены пачатак першай у Беларусі калгаснай шматтыражнай газеце. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 20 двароў 43 жыхары.

**ВАРОДЗЬКАЎ-2** , вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў– Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1858 г. 9 двароў, 32 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1926 г. 52 двары, 292 жыхары. У 1925 г. адкрыта школа. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Зорка». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 36 двароў. З 1962 г. у складзе калгаса «Перамога». Радзіма двойчы Героя Савецкага Саюза, генерала арміі І.І. Гусакоўскага. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 45 жыхароў

**ВАРОДЗЬКАЎ-3**, вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Побач з вёскай, на правым беразе р.Воўчас, захаваўся старажытны могільнік, які сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XIX ст. Непадалёку быў маёнтак. У 1858 г. 2 двары, 16 жыхароў, уласнасць памешчыка. З 1882 г. дзейнічалі царква і касцёл, пабудаваны з дрэва. У 1926 г. 52 двары, 267 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвонаармеец». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 9 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1962 г. у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 19 двароў, 43 жыхары.

**ВЯРХОЎЦЫ,** вёска, за 32 км на паўночны захад ад Крычава, 72 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў. З 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1847 г. сяло (2 двары, 7 жыхароў) і фальварак (7 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, а ў 1876 г. паявіўся яшчэ адзін, гаспадар якога валодаў 543 дзесяцінамі зямлі. Дзейнічала царква (з 1882), пабудаваная з дрэва. Меліся пастаялы двор, царква і царкоўна-прыходская школа. Частка вяскоўцаў займалася бандарным рамяством. У вясковай школе, створанай на базе дарэвалюцыйнай, было ў 1925 г. 49 вучняў. Па перапісу насельніцтва ў 1926 г. у вёсцы і навакольных хутарах 78 двароў, 397 жыхароў. У жніўні

1929 г. арганізаваны калгас «Бальшавік». У 1940 г. 35 двароў, 170 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разграмілі паліцэйскі ўчастак, які размяшчаўся ў вёсцы. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

**ВЯСЁЛЫ,** пасёлак, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша–Клімавічы.

Заснаваны ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях, у 1931 г. арганізаваны калгас «Вясёлы шлях», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 17 гаспадарак. У 1940 г. 13 двароў, 52 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 7 двароў, 9 жыхароў.

**ГОРКІ,** вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

За 0,4 км на захад ад вёскі, за ровам, дзе цячэ ручай, захавалася гарадзішча XIV– XVI ст. Насупраць, на схілах левага берага р. Любавічка (прыток р. Воўчас) размешчана селішча XIV–XVII ст. Гэтыя археалагічныя помнікі сведчаць аб засяленні тутэйшых мясцін у далёкай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. 67 двароў, 477 жыхароў, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1921 г. створана працоўная школа 1-й ступені, у якой было 84 вучні. З 1920 г. пачала дзейнічаць школа па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. З 24.06.1960 г. далучана да Бацьвінаўскага сельсавета. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шляхсацыялізму», працавала кузня. У 1940 г. 36 двароў, 161 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вызвалення адбудавана. З 1958 г. у калгасе «Радзіма», з 1960 г. у складзе калгаса імя Суворава. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 39 жыхароў.

**ГУБЕНШЧЫНА,** вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1749 г. сяло, 22 двары, у Мсціслаўскім ваяводстве. Мелася карчма. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у складзе Раей. Уваходзіла ў Чэрыкаўскаю акругу Магілёўскай губерні. У 1810 г. заснавана сукнавальня. У 1816 г. 60 двароў, 347 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1847 г. цэнтр маёнтка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога у 1860 г. меў у вёсках Губеншчына і Міляцін 648 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. У 1880 г. 67 двароў, 487 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кавальскім, сталярным, кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1897 г. сяло (99 двароў 723 жыхары), маёнтак (1 двор, 7 жыхароў) і сядзіба (1 двор, 7 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучаліся 53 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі. У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У студзені 1906 г. сяляне на сваім сходзе вырашылі працаваць у памешчыкаў з 1 лютага толькі пры ўмове больш справядлівай аплаты. У 1909 г. у сяле 117 двароў, 813 жыхароў, на сядзібе 1 двор, 7 жыхароў, у маёнтку 1 двор, 7 жыхароў і на хутарах 4 двары, 20 жыхароў. Вёска была ў складзе Воўчаскага праваслаўнага прыходу. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 72 вучні, дзейнічала хата-чытальня, якая размяшчалася ў нацыяналізаваным будынку. У верасні 1923 г. арганізавана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства, у 1930 г. калгас імя І.В. Сталіна, мелася кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 35 двароў, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1950 г. у калгасе імя Калініна, які ў 1965 г. перайменаваны ў калгас імя А.В.Суворава.

Радзіма поўнага кавалера ордэна Славы У.Я. Карнеенкі. Вёсказнікла на 1.1.2003г.

**ДАЛЕНШЧЫНА,** вёска, за 35 км на паўночны захад ад Крычава, 69 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. вёска, 14 двароў, 76 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1816 г. уласнасць памешчыка. У 1848 г. у складзе маёнтка Беліца. У1897 г. 26 двароў, 110 жыхароў, у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. адкрыта земская школа, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. На базе дарэвалюцыйнай створана была працоўная школа 1 -й ступені, у якой у 1925 г. было 38 вучняў, а ў 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 52 двары, 249 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя С.М. Будзённага. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разграмілі створаны акупантамі ў вёсцы паліцэйскі ўчастак. Гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. З 16.07.1954 г. у Бацьвінаўскім сельсавеце, з 1962 г. у Мсціслаўскім, з 1965 г. зноў у Крычаўскім раёне. 31957 г. у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 26 двароў, 51 жыхар.

**ДРУЖКІ,** вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Заснавана ў 1920-х гг. на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У 1940 г. 18 двароў, 82 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 25 дваpoy, 48 жыхароў.

**ЗАЙЦАВА СЛАБАДА**, вёска, за 18 км на захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1834 г. 37 жыхароў, уласнасць памешчыка, у 1847 г. у складзе маёнтка Бацьвінаўка Чэрыкаўскага павета. Памешчык Цялушкін меў у 1849 г. у вёсках Зайцава Слабада (яна ж Галынка) і Дарлівае 100 дзесяцін зямлі. У 1897 г. вёска (18 двароў, 113 жыхароў) і 2 аднайменныя хутары (20 двароў, 136 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 38 двароў 227 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». З 1937 г. у вёсцы размяшчалася 2-я Крычаўская МТС (рэарганізавана 31.03.1958 г.). У 1938г. МТС мела 23 трактары і іншую тэхніку. У 1940 г. 33 двары, 143 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г.да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы разрабавалі маёмасць і ў верасні 1943 г. поўнас- цю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 16 двароў, 46 жыхароў.

**КАНЦЫ,** вёска, за 23 км на паўночны захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. Спачатку гэта быў пасёлак у Бацьвінаўскім сельсавеце. У 1930-х гг. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На могілках пахаваны 11 савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць гітлераўцаў. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 27 двароў, 67 жыхароў.

**КАСЦЮКОЎКА,** вёска, за 30 км на захад ад Крычава, 72 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) – у Расіі. У 1780 г. 7 двароў, 65 жыхароў, у 1858 г. 10 двароў, 101 жыхар, уласнасць памешчыка. З 1928 г. дзейнічала маслабойня, у 1930 г. арганізаваны калгас «Новы шлях». У 1940 г. 37 двароў, 142 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня

1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

**ЛУЧКІ,** пасёлак, за 16 км на паўночны захад ад Крычава, 88 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У дарэвалюцыйных выданнях і архіўных дакументах населены пункт з такой назвай не сустракаецца. У 1940 г. 37 двароў, 177 жыхароў, У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 18 двароў 30 жыхароў.

**МАЛІНАЎКА,** вёска, за 23 км на паўночны захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 17 жыхароў.

**МАСЦІЦКАЯ СЛАБАДА,** вёска, за 17 км на паўночны захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. Сяло Слабада Чэрыкаўскай акругі Магілёўскай губерні. У 1835 г. в. Масціцкая Слабада перайшлаў валоданне памешчыка А.А. Маскевіча. У 1897 г. 21 двор, 158 жыхароў, Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 21 двор, 160 жыхароў. У 1926 г. 59 двароў, 217 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых і хата-чытальня. У 1931 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна (у 1932 г. аб’ядноўваў 39 гаспадарак), з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 3 1964 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 15 двароў, 32 жыхары.

**МІЛЯЦІН,** вёска, за 27 км на захад ад Крычава, 77 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў-Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XIX ст. У 1838 г. вёска (14 рэвізскіх душ), уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1860 г. меў у вёсках Міляцін і Губеншчына 648 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. У 1926 г. дзейнічалі хата-чытальня і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К.Я. Варашылава. У 1940 г. 25 двароў, 117 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 2.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Зараз у складзе калгаса імя А.В.Суворава. На 1.1.2003 г. 2 двары, 4 жыхары.

**ПАДУДАГА,** пасёлак, за 23 км на захад ад Крычава, 81 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У дарэвалюцыйных крыніцах звестак не выяўлена.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя А.В.Суворава. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

**ПРУСІНА,** вёска, за 17 км на паўночны захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай увайшлаў склад Раей. У 1779 г. сяло, 24 двары, 158 жыхароў, у Крычаўскім старостве Клімавіцкага павета, уласнасць памешчыка. У1781 г. цэнтр староства ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскага намесніцтва, дзяржаўная ўласнасць. Непадалёку быў маёнтак, гаспадару якога ў 1862 г. належала 596,5 дзесяціны зямлі. У 1876 г. з’явіўся яшчэ адзін маёнтак, гаспадар якога валодаў 231 дзесяцінай зямлі. Дзейнічала школа граматы (адкрытане пазней 1880г.). У 1897 г. вёска Прусін (53 двары, 363 жыхары), пастаялы двор (1 двор, 7 жыхароў), фальварак Прусін (ён жа Паўладар, 1 двор, 4 жыхары) і яшчэ адзін

фальварак Прусін (1 двор 10 жыхароў). У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучалася 69 хлопчыкаў і 6 дзяўчынак. У 1909 г. вёскі Прусін-1 (19 двароў 148 жыхароў) і Прусін-2 (33 двары, 260 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні.

На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 40, у 1926 г. 56 вучняў з вёсак Прусіна, Масціцкая Слабада, пасёлка Лучкі і навакольных хутароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Бязбожнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 53 гаспадаркі, абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вызвалення адноўлены калгас, вёскі аб'ядналіся ў адну. З 1950 г. у калгасе імя Леніна, з 1954 г. у складзе калгаса імя Леніна, з 1964 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 18 двароў, 38 жыхароў.

**РАТНАЯ,** вёска, за 30 км на захад ад Крычава, 74 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў—Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніцах XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. 7 двароў, 40 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У1858 г. 7 двароў, 44 жыхары, уласнасць памешчыка.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1926 г. 23 двары, 125 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Камсамолец». У 1940 г. у вёсцы 31 двор, 169 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У маі 1942 г. партызаны атрада «Чапай» разграмілі нямецка-паліцэйскі ўчастак, які акупанты размясцілі ў вёсцы. Гітлераўцы спалілі 27 двароў. Зараз у складзе калгаса «Перамога». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 15 жыхароў.

**РЭПІШЧА,** вёска, за 16 км на захад ад Крычава, 88 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Узнікла ў сярэдзіне 1930-х гг. у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў. У 1940 г. 23 двары, 95 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. З 1964 г. у складзе калгаса «Звязда».

**СЕТНАЕ,** вёска, за 25 км на захад ад Крычава, 76 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вёска ў дарэвалюцыйных крыніцах з такой назвай не сустракаецца. У 1930 г. арганізаваны калгас «Шлях сацыялізму». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 10 жыхароў.

**СЫЧЫКІ,** вёска, цэнтр калгаса А.В. Суворава, за 25 км на захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

У1930 г. арганізаваны калгас імя М.І. Калініна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. аку піравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы у верасні 1943 г. спалілі 38 двароў. З 1950 г. уваходзіла ў калгас імя Калініна, з 1965 г. – цэнтр калгаса імя Суворава.

Радзіма беларускага крытыка і літаратуразнаўцы Дз.Я. Бугаёва. На 1.1.2003 г. 120 двароў, 324 жыхары.

**ЦІНЬКАВА,** вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 1 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў– Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. З 1857 г. побач быў фальварак, 8 жыхароў, уласнасць памешчыка, і маёнтак, гаспадар якога ў 1836 г. меў 582 дзесяціны зямлі, млын і сукнавальню. У 1897 г. вёска Цінькаў (яна ж Янаўка) у Беліцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1926 г. 15 двароў, 79 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камуніст», дзейнічаў вадзяны млын (збудаваны ў 1908 г.). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана ня-

мецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у калгасе «Перамога». На 1.1.2003 г. 28 двароў, 48 жыхароў.

**ЮРКАЎКА,** вёска, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1762 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць, меўся млын. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1816 г. 19 двароў, 216 жыхароў, уласнасць памешчыка. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся кавальскім, кравецкім і іншымі промысламі. У 1897 г. сяло (43 двары, 266 жыхароў) і выселак (1 двор, 7 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У снежні 1918 г. адкрыта школа, у якой у 1920-х гадах навучаліся дзеці з вёскі Юркаўка і пасёлкаў Фермы, Селішчы, Бранскі. У 1926 г. 64 двары, 345 жыхароў. У сакавіку 1930 г. арганізаваны калгас «Барацьбіт». З 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У 1932 г. калгас аб'ядноўваў 67 гаспадарак, мелася кузня. У 1940 г. 45 двароў, 265 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі 42 двары. Пасля вайны адбудавана. З 25.12.1962 г. у Мсціслаўскім, а з 6.01.1965 г. зноў у Крычаўскім раёне. З 1954 г. у калгасе імя Леніна, з 1963 г. у складзе калгаса «Звязда». На 1.1.2003 г. 19 двароў, 34 жыхары.

**ЯНОЎ,** вёска, за 36 км на захад ад Крычава, 68 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. сяльцо ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1857 г. 833 дзесяцінамі зямлі, меў вадзяны млын і сукнавальню. У 1858 г. 6 двароў, 36 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1897 г. побач з вёскай быў фальварак (1 двор, 8 жыхароў), уваходзіла ў Камаровіцкую воласць Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Мелася карчма. У 1909 г. вёска Янава Слабада (11 двароў, 72 жыхары) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У вясковай працоўнай школе 1-й ступені ў 1926 г. было 23 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Ударнік». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1965 г. у складзе калгаса імя А.В. Суворава. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

## КАСЦЮШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

**ВОЛЧАС,** вёска, за 18 км на захад ад Крычава, 76 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

За 3 км на захад ад вёскі захавалася гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур, за 350 м на захад ад вёскі – селішча эпохі Кіеўскай Русі і сярэднявечча, за 250 м на поўнач ад вёскі – старажытны могільнік, што сведчыць аб засяленні тутэйшых месц у глыбокай старажытнасці. У пісьмовых крыніцах упершыню вёска ўпамінаецца ў 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1768 г. меўся маёнтак. У1782 г. цэнтр Стара-Воўчаскага староства, у Чэрыкаўскім павеце, меліся фальварак, царква, вінакурня, 2 карчмы. У 1780 г. 18 двароў, 131 жыхар.

Памешчык меў тут у 1875 г. 154, у 1879 г. –166 дзесяцін зямлі. У 1875 г. адкрыта школа, з 1882 г. дзейнічала пабудаваная з дрэва царква. У 1885 г. 22 двары, 132 жыхары, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. вёска Воўчас-1 (6 двароў, 32 жыхары) і сяло Воўчас-2 (49 двароў, 35 жыхароў, царква, царкоўнапрыходская школа), фальварк Воўчас (1 двор, 9 жыхароў) і маёнтак Воўчас (ён жа Сячыха, 1 двор, 14 жыхароў).

На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 97 вучняў. Дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна. У1940 г. 69 двароў 283 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 21–22 лютага 1942 г. каля вёскі партызаны атрада «Анатоля» вялі цяжкія баі супраць гітлераўскіх карнікаў. У ве-

расні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. З 1959 г. – цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 37 двароў 94 жыхары.

**ГРУШАВА**, пасёлак, за 7 км на паўночны захад ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Заснаваны у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1940 г. – 12 двароў 53 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 9 двароў загубілі 3 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. Цяпер у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 14 двароў 27 жыхароў.

**ГУРКАВА НІВА**, вёска, за 17 км на захад ад Крычава, 87 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1897 г. выселак (8 двароў 66 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1930 г. арганізаваны калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

**ДАРАГАЯ**, вёска, за 12 км на захад ад Крычава, 92 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. вёска (9 двароў 47 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У канцы 90-х гадоў XIX ст. частка вяскоўцаў перасялілася на жыхарства ў Амурскі край. У 1897 г. 28 двароў, 210 жыхароў у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Меўся пастаялы двор. У 1908 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1909 г. 29 двароў 164 жыхары. У 1923 г. на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якая размясцілася ў былым маёнтку Лушчэвінкі. У1925 г. у школе былі 33 вучні. У выніку перасялення часткі вяскоўцаў паблізу былі ўтвораны ў 1923 г. пасёлкі Доўгі Лог, Новая Дарагая, Ферма, Бранскі, Цэнтральны, Смолішча, большасць з якіх зараз не існуе. У1926 г. 61 двор, 315 жыхароў. У лютым 1931 г. арганізаваны калгас «Камунар», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 60 гаспадарак, працавала кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 10 двароў, 45 жыхароў.

**ДАРЛІВАЕ**, вёска, за 9 км на паўночны захад ад Крычава, 95 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. З 1772 г. у складзе Раей. У 1777 г. Дарлівае ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 10 двароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1834 г. уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1849 г. у вёсках Дарлівае і Зайцава Слабада 100 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 33 двары, 208 жыхароў у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета.

15.10.1918 г. адкрыта школа, якая першапачаткова размясцілася ў наёмным, затым у нацыяналізаваным царкоўным будынку, а ў 1923 г. для школы пабудавана новае памяшканне. У 1925 г. у школе было 45 вучняў. У вёсцы дзейнічала хата-чытальня, меўся ветраны млын. У 1926 г. 57 двароў 257 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Свабода», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 47 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 10 двароў 45 жыхароў.

**ДОЎГІ ЛОГ,** пасёлак, за 10 км на захад ад Крычава, 94 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l на лініі Крычаў–Магілёў

Узнік у 1923 г. у выніку перасялення сюды часткі жыхароў з в. Дарагая. У 1926 г. 8 двароў 36 жыхароў. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 12 жыхароў.

**ДУБОЎСКІ**, пасёлак, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Утвораны ў 1920-х гадах на былых па-

мешчыцкіх землях. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У 1940 г. 13 двароў, 69 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 11 двароў. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

**ЗАЛЕСАВІЧЫ,** вёска, за 5 км на паўночны захад ад Крычава, 99 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVII ст. У 1604 г. у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. Уваходзіла ў Чэрыкаўскую акругу Магілёўскай губерні. У 1780 г. сяло, 10 двароў, 55 жыхароў. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1859 г. 150 дзесяцін зямлі. З 1882 г. дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1883 г.). Дзейнічала царкоўнапрыходская школа. З 26.04.1919 г. у Чэрыкаўскім павеце Гомельскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 г. у Дарліўскім сельсавеце.

На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 32 вучні, дзейнічаў драматычны гурток і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 90 двароў, 425 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Новае Сормава», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 42 гаспадаркі, працавалі кузня, сталярная і цяслярная майстэрні. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе імя Леніна (пазней «Памяць Леніна»), з 1967 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 72 двары, 191 жыхар.

**КАЛІНІНА** (да 1938 г. Задабрасць), вёска, за 5 км на поўдзень ад Крычава, 109 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы. У в. Задабрасць і Крычаве памешчык меў у 1878 г. 1588 дзесяцін зямлі, 3 вадзяныя млыны, піцейны дом і вінакурны завод. У 1897 г. побач з сялом быў фальварак (5 двароў, 29 жыхароў), у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічалі вінакурны завод і вадзяны млын. У 1909 г. сяло Нова-Сакольнічы (Бачкі), 35 двароў, 313 жыхароў і маёнтак Задабрасць (1 двор, 2 жыхары). У 1915 г. адкрыта земская школа. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 46 вучняў. Дзейнічала хата-чытальня. У 1926 г. 55 двароў, 328 жыхароў. У 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны шлях». Працавалі вінакурны завод і кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 29 двароў, 255 жыхароў.

**КАМАРОЎКА,** вёска, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. вёска (50 двароў, 379 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1897 г. 68 двароў, 463 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У лютым 1900 г. вяскоўцы правялі ў маёнтку Дзяржа самавольную высечку лесу. Меліся школа граматы, ветраны млын (пабудаваны ў 1904 г.), казённая вінная лаўка. У1911 г. адкрыта земская школа, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 62 вучні. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці дарослых. У 1928 г. для школы пабудавана памяшканне. У 1926 г. 125 двароў, 725 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгасы «Авангард» і «Новае жыццё», былі ветраны млын і кузня. Абслугоўвала калгасы Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі вёску. 22.02.1942 г. каля вёскі адбыўся бой паміж 7-ю партызанамі і гітлераўцамі. З 1981 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 62 жыхары.

**КАСЦЮШКАВІЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета (з 21.08.1925 г.) і калгаса «Памяць Леніна», за 9 км на захад ад Крычава, 95 км ад Магілёва, 14 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1560 г., як сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная

уласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у Расіі, сяльцо Касцюшкавічы. У 1827 г. мястэчка, 152 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1866 г. 170 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 46 двароў, 333 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася шавецкім рамяством. У 1908 г. адкрыта земская школа. У 1909 г. у вёсцы 46 двароў, 397 жыхароў, у ваколіцы 13 двароў 93 жыхары.

У 1919 г. створаны камітэт беднаты, які ўзначаліў вясковец А.Ф.Свадкоўскі. Працавала школа, для якой у 1924 г. пабудавана памяшканне. У 1925 г. займалася больш за 50 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці дарослых. У 1926 г. 86 двароў, 495 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя У.І. Леніна (старшыня А.Ф. Свадкоўскі). У 1932 г. калгас аб'ядноўваў 62 гаспадаркі. З сярэдзіны 1930-х гадоў дзейнічаў фельчарскі пункт, у 1937 г. пабудаваны магазін. У 1940 г. у вёсцы 78 двароў, 318 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 71 двор, загубілі 5 жыхароў. Вызвале- на 1.10.1943 г. Пасля вайны адбудавана. У 1962 г. калгас атрымаў назву «Памяць Леніна». У гонар першых трактарыстаў калгаса і 50-годдзя гаспадаркі ў 1981 г. у цэнтры вёскі на пастаменце пастаўлены трактар «Універсал». На 1.1.2003 г. 139 двароў, 411 жыхароў.

**КЛІНОЎСКІ,** пасёлак, за 15 км на паўночны захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у канцы 1930-х гадоў у выніку перасялення сюды сялян з бліжэйшых хутароў. Уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У 1940 г. 32 двары, 56 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 11 двароў. Пасля вайны адбудаваны. Цяпер у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 32 двары, 99 жыхароў.

**ЛУШЧЭВІНКА,** вёска, за 15 км на захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У 1780 г. у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.

Памешчык тут меў у 1861 г. 417 дзесяцін зямлі. У 1880 г. 13 двароў, 84 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася бандарствам. У 1897 г. вёска (23 двары, 159 жыхароў) і фальварак (2 двары, 12 жыхароў), у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У пачатку XX ст. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1907 г. навучалася 56 хлопчыкаў і 13 дзяўчынак. У 1926 г. 68 двароў, 335 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя К. Маркса. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 66 двароў, 134 жыхары.

**МАКАЎЕ,** вёска, за 8 км ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. сяльцо (6 двароў, 12 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1897 г. 26 двароў, 174 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. З 1909 г. дзейнічала школа (народнае вучылішча). Пры Савецкай уладзе на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, дзейнічала бібліятэка. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Л.Б. Красіна, мелася кузня. У 1940 г. 58 двароў, 289 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 53 двары. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 8 двароў, 8 жыхароў.

**МАЛЬКАЎКА,** вёска, за 19 км на захад ад Крычава, 85 км ад Магілёва, 9 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома з пісьмовых крыніц XVIII ст. З 1772 г. у складзе Расіі. У Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1816 г. 8 двароў 9 жыхароў, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1879 г. меў 2260 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 16 двароў 127 жыхароў у Камаровіцкай воласці Чэрыкаў-

скага павета. Была адкрыта школа граматы. У1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны пераможнік». Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1940 г. 19 двароў 57 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У розныя гады ўваходзілаў калгасы імя Леніна, «Савецкая Беларусь». З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

**НОВІКІ** (да 30.07.1964 г. Балванаўка), вёска, за 14 км на захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У1768 г. вёска Балванаўка і аднайменны маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 15 двароў, 91 жыхар. У 1834 г. вёска і фальварак, уласнасць памешчыка, які меў у 1846 г. 139 дзесяцін зямлі. У1897 г. 21 двор, 161 жыхар, у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1919 г. з в. Лушчэвінка сюды пераведзена школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні, у 1925 г. было 24 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас. У 1940 г. 32 двары, 151 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 3 жыхароў На 1.1.2003 г. 11 двароў, 16 жыхароў.

**ПАД'ЯЛЕЦКІ,** пасёлак, за 13 км на паўночны захад ад Крычава, 91 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. Уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У 1940 г. 10 двароў 46 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні,1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі пасёлак, загубілі 2 жыхароў. Пасля вайны адбудаваны. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

**ПАКЛАДЫ,** вёска, за 7 км на поўдзень ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі захавалася селішча жалезнага веку і часоў сярэднявечча, на паўднёва-усходняй ускраіне, уздоўж правага берага р.Сож, – старажытны могільнік (11 насыпаў), на паўночным усходзе – старажытны курган, што сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая уласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. сяльцо, 9 двароў 45 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні.

У 1919 г. у былым маёнтку створана арцель «Брацкая праца». У 1926 г. 31 двор, 168 жыхароў. Дзейнічала працоўная школа 1-й ступені ( 37 вучняў) і дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя К.Я. Варашылава. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Да вайны ў вёсцы жыла Т.М. Гіндзіна, першая ў раёне жанчына-трактарыстка, з 1937 г. брыгадзір трактарнай брыгады, затым старшыня Сакольніцкага сельсавета. У час Вялікай Айчынай вайны – дэсантніца. Загінула ў лістападзе 1942 г. ля в. Сакольнічы.

На паўднёва-заходняй ускраіне радовішча крэйды Забялышанскае поле (разведаныя запасы – 37,9 млн т.).

Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 51 двор, 128 жыхароў.

**ПЕРШАКРЫЧАЎСКІ,** пасёлак, за 6 км на поўдзень ад Крычава, 110 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

За 0,5 км на паўночны ўсход ад пасёлка захаваўся старажытны курганны могільнік (7 насыпаў), які сведчыць ад засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці. Сучасны пасёлак узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1926 г. 37 двароў 186 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас імя В.К. Блюхера. У Вялікую Айчынную

Вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 25 двароў, 63 жыхары.

**ПРЫГАЎКА,** вёска, за 6 км на паўднёвы захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1811 г. бдвароў 16 жыхароў мужчынскага полу, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 14 двароў 112 жыхароў у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета.

На пачатку 1920-х гадоў адкрыта працоўная школа 1-й ступені, дзе навучаліся дзеці з вёсак Прыгаўка, Свадкавічы і навакольных хутароў. У 1926 г. 49 двароў 185 жыхароў. У 1930-я гады створаны калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Вясковец Г.Ю. Давыдзенка быў камісарам партызанскага атрада №8 імя М.Н. Селіваненкі брыгады імя А.Ф. Данукалава, якая дзейнічала ў Віцебскай вобласці. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 21 двор, 54 жыхары.

**ПУШКАРЫ,** пасёлак, за 6 км на захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

У 1940 г. 10 двароў, 53 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча».

**САКОЛЬНІЧЫ,** вёска, цэнтр калгаса «Запаветы Леніна», за 4 км на паўднёвы захад ад Крычава, 100 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Бытуе легенда, што ў час Паўночнай вайны (1700–1721) вызначыўся генерал Сакалоў якому за геройскія здзяйсненні была выдзелена зямля каля Крычава. Генерал падзяліў зямлю паміж 7 сестрамі, які сталі тут жыць. Так узнікла невялікае паселішча Сакольнічы. Па пісьмовых крыніцах вёска вядома з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. З 1772 г. у складзе Расіі.

Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882). У 1897 г. ваколіца (96 двароў, 623 жыхары, вадзяны млын) і вёска Нова-Сакольнічы (33 двары, 227 жыхароў) у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1905 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. Ураджэнец вёскі А.І. Попель удзельнічаў у штурме Зімняга палаца ў Петраградзе ў 1917 г. і стаў вядомы тым, што даставіў У.І. Леніну пакет аб узяцці Зімняга. Загінуў у 1918 г. пад Архангельскам.

У пачатку 1918 г. па ініцыятыве вясковага хлопца У.Ц. Кашуры створаны камітэт сялянскай моладзі. Крычаўскі валасны Савет выдзеліў членам камітэта дзесяціну зямлі, якую яны апрацоўвалі сумесна, а прыбытак ад гаспадаркі накіроўваўся на дапамогу Чырвонай арміі. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені. На пачатку 1925 г. у Сакольніцкім сельсавеце працавалі 2 хаты-чытальні, 3 пачатковыя школы, кааператыўная лаўка, сельгасарцель, камуна, 3 вадзяныя млыны, кузня. Дзейнічала камсамольская ячэйка, якой кіраваў Я. Васілевіч (у 1930-х гадах працаваў начальнікам палітаддзела Крычаўскай МТС). У 1925 г. у вёсцы створаны першы ў раёне піянерскі атрад (22 піянеры), а ў школе ў гэты час было 26 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 132 двары, 684 жыхары. Ваколіца Сакольнічы была ліквідаванаў 1918 г. У 1931 г. арганізаваны калгас «Запаветы Ільіча» (у 1932 г. – 60 гаспадарак) і імя І.В. Сталіна (у 1932 г. – 50 гаспадарак), якія ў 1934 г. аб'ядналіся ў адзін калгас «Запаветы Ільіча». Працавалі 2 кузні. Дзейнічаў фельчарска-акушэрскі пункт. У Вялікую Айчынную вайну з сярэдзіны 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Каля вёскі 17.07.1941 г. вёў цяжкі бой супраць гітлераўскіх танкаў савецкі артылерыст, старшы сяржант М.У. Сірацінін. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, каля шашы Крычаў–Чэрыкаў у 1961 г. узведзены помнік адважнаму артылерысту. У 1942 г. партызаны разграмілі ўправу акупантаў і маслазавод, якія размяшчаліся ў вёсцы. У 1943 г. гітлераўцы

спалілі вёску. З 1954 г. у Касцюшкавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары; 3 жыхары.

**САСНОЎСКІ,** пасёлак, за 14 км на паўночны захад ад Крычава, 90 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1930-х гадах у выніку перасялення сюды сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіў у Паланіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. Зараз у складзе калгаса «Бель». На 1.1.2003 г. 7 двароў, 11 жыхароў.

**СВАДКАВІЧЫ,** вёска, за 5 км на паўднёвы захад ад Крычава, 99 км ад Магілёва, 9 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVI ст. У 1560 г. сяло ў Крычаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1768 г. тут быў маёнтак, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1780 г. 13 двароў, 73 жыхары, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1817 г. у фальварку, што быў побач з сялом, заснавана сукнавальня. З 1813 г. працаваў вінакурны завод. У 1875 г. гаспадар маёнтка меў 485 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, сукнавальню і карчму. Дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. У 1897 г. 22 двары, 121 жыхар, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 36 двароў, 157 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых.У 1930 г. арганізаваны калгас «Новы шлях», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 34 гаспадаркі, працавала кузня. У 1940 г. 38 двароў, 193 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 37 двароў загубілі 1 жыхара. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча».

Радзіма аднаго з кіраўнікоў рэвалюцыйнага народніцкага руху ў 70-х гадах XIX ст. С.П.Каваліка. На 1.1.2003 г. 34 двары, 77 жыхароў.

**СЯЧЫХА,** вёска, за 15 км на захад ад Крычава, 89 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Асавец на лініі Крычаў–Магілёў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) увайшла ў Расію. У 1870 г. 23 двары, 107 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1847 г. 10 двароў, 43 жыхары, у складзе маёнтка Воўчасы, уласнасць памешчыка. Непадалёку быумаёнтак, гаспадар якога меў у 1853 г. 108 дзесяцін зямлі. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. У 1897 г. сяло (30 двароў, 202 жыхары) і фальварак (2 двары, 10 жыхароў) у Камаровіцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 34 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С.М.Будзённага. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1980 г. у складзе калгаса «Памяць Леніна». На 1.1.2003 г. 12 двароў, 21 жыхар.

**ХАЦІЛАВІЧЫ,** вёска, за 6 км на паўднёвы захад ад Крычава, 98 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1663 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі, вёска ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. еяльцо (22 двары, 119 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце, належала Галынскім. У 1869 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1897 г. 59 двароў, 403 жыхары, у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Побач была аднайменная ваколіца (4 двары, 20 жыхароў). У 1909 г. у вёсцы 65 двароў 533 жыхары, у ваколіцы 4 двары, 43 жыхары, у Крычаўскім праваслаўным прыходзе. З 26.04.1919 г. у Чэрыкаўскім павеце Гомелькай губерні РСФСР. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1924 г. вяскоўцы пабудавалі памяшканне (у 1926 г. 70 вучняў). Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. у вёсцы 98 двароў, 519 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Сталінскі заклік», працавала ваўначоска. У 1940 г. 87 двароў, 362 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі 73 двары, загубілі 3 жыхароў. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Ільіча». На 1.1.2003 г. 67 двароў, 125 жыхароў.

## ЛАБКОВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ.

**АНАНІЧЫ,** вёска, за 13 км на поўнач ад Крычава, 127 км ад Магілёва, 10 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) увайшла ў склад Расіі. У 1780 г. 31 двор, 285 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце. У 1848 г. у складзе дзяржаўнага маёнтка Кашаны. У 1875 г. сяляне зрабілі самавольную высечку лесу, а ў верасні 1879 г. самавольна выкарысталі ў сваіх мэтах нарыхтаваны памешчыцкі лес. У 1909 г. 60 двароў, 355 жыхароў, 630 дзесяцін зямлі. У 1910 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1926 г. 94 двары, 171 жыхар. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 75 вучняў. Дзейнічаў пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. З пачатку 1930-х гадоў арганізаваны калгас «Пралетарскі араты». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ураджэнка вёскі Ф. Калбеева былаўдзельніцай Мінскага камуністычнага падполля. З 1962 г. вёска ў складзе калгаса імя XXII з’езда КПСС. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 11 жыхароў.

**БАЯРЫ,** вёска, за 18 км на поўнач ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l. На поўнач ад вёскі цячэ р. Чорная Натапа (прыток р.Сож). За 1 км на поўдзень знаходзіцца найвышэйшы пункт раёна (193 м).

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1872 г. у вёсках Баяры і Адбыткі 116 дзесяцін зямлі. У 1897 г. 9 двароў 64 жыхары, кузня і аднайменная ваколіца.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. На валасным сходзе 18.06.1919 г. вяскоўцы заявілі аб сваёй гатоўнасці па Першаму закліку рабоча-сялянскай улады выступіць на абарону савецкай рэспублікі. У 1926 г. 31 двор, 189 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя В.М. Молатава, які ў 1932 г. аб’яднoўваў 30 сялянскіх гаспадарак, працавала кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г.акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у складзе калгаса імя К. Маркса.Ла 1.1.2003 г. 6 двароў 7 жыхароў.

**БЕЛЬ** (да 1976 г. Бель-1), вёска, цэнтр калгаса імя XXII з’езда КПСС, за 9 км на поўнач ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

З 1772 г., пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, у складзе Расіі. У 1780 г. сяло Бель (62 двары, 344 жыхары), сяльцо Бель (25 двароў, 135 жыхароў) і вёска Бель (10 двароў, 122 жыхары), у ведамстве казённай палаты. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1874 г. валодаў 1150 дзесяцінамі зямлі, меў вадзяны млын, карчму, вінакурны завод. З 1882 г. дзейнічала царква, пабудаваная з дрэва. У 1884 г. у в. Бель-1 адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1897 г. 113 двароў, 819 жыхароў. У 1908 г. адкрыта школа ў в.Бель-3, якая размяшчалася ў наёмным памяшканні. У тым жа годзе была адкрыта школа і ў в.Бель-2. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1909 г. вёскі Бель-1 (130 двароў, 834 жыхары), Бель-2 (70 двароў 775 жыхароў), Бель-3 (39 двароў 355 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Царкоўны будынак быў перададзены для школы у в. Бель-1, у якой у 1925 г. быў 101 вучань. Дзейнічалі школы і ў вёсках Бель-2, Бель-3, а таксама пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У першай палове 1920-х гадоў у выніку перасялення часткі вяскоўцаў былі паблізу ўтвораны пасёлкі Зара, Горскі, Галсееўскі, Залескі, Гарадок, хутары Зарэчны, Лісічка, якія зараз не існуюць. У 1925 г. створана закупачна-збытавое таварыства. У 1926 г. у в. Бель-1 211 двароў, 1282 жыхары, у в. Бель-2 98 двароў, 598 жыхароў, у в.Бель-3 72 двары, 410 жыхароў. У1929 г. арганізаваны калгас «Шлях да сацыялізму» (у 1932 г. аб’ядноўваў 40 гаспадарак) і імя І.В. Сталіна (у 1932–34 гаспадаркі), якія з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 31.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На вясковых могілках пахаваны ўраджэнец вёскі, лётчык А.В. Гуменнікаў які 13.07.1941 г. загінуў у паветраным баі над роднай вёскай. З 16.07.1954 г. у Лабковіцкім сельсавеце. У 1976 вёскі

Бель-2, Бель-3 далучаны да в. Лабковічы.

Радзіма актыўных удзельнікаў свеабаргскага паўстання балтыйскіх маракоў у 1906 г. М.Бабровіча, А.Стэльмахава і В. Гуменькава, беларускага вучонага, Героя Сацыялістычнай Працы М.А. Цытовіча. На 1.1.2003 г. 155 двароў, 408 жыхароў.

**БЕРАЖЫСТАЕ,** вёска, за 10 км на поўнач ад Крычава, 94 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. З 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. 8 двароў, 68 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У першай палове 1920-х гадоў у выніку перасялення часткі вяскоўцаў паблізу ўтварыліся пасёлкі Варанёва, Старана, Іванава, Зусьчына, хутары Юзэфава і Леніна, якія зараз не існуюць. У 1926 г. 51 двор, 288 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Малады ударнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 21 гаспадарку. У Вялікую Айчыннуювайнузліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Камінтэрн», з 1959 г. – імя Сталіна. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 33 двары, 61 жыхар.

**БУНЬКАЎШЧЫНА,** пасёлак, за 20 км на поўнач ад Крычава, 124 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Узнік у 1923 г. у выніку перасялення на былыя памешчыцкія землі часткі сялян з в.Стараселле. У 1926 г. Бунькаўшчына-1 (16 двароў, 81 жыхар) і Бунькаўшчына-2 (8 двароў, 31 жыхар) у канцы 1930-х гадоў аб'ядналіся. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя К. Маркса. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 37 жыхароў.

**ГАРБАТКА,** вёска, за 8 км на поўнач ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Раей, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1858 г. 30 двароў, 220 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1874 г. памешчык меў у в. Гарбатка і Бель 150 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, карчму і вінакурны завод, заснаваны ў 1862 г. У1880 г. 35 двароў, 210 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім і іншымі рамёствамі. У 1897 г. вёска (43 двары, 297 жыхароў) і аднайменны фальварак (7 двароў, 54 жыхары, вінакурны завод) у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічала аднакласная школа. У1926 г. 76 двароў, 396 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «XII з'езд Саветаў». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік». Зараз у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 28 двароў 49 жыхароў.

**ГЛУШНЁВА,** вёска, за 9 км на поўнач ад Крычава, 113 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Маёнтак Глушнёва ў Мсціслаўскім ваяводстве Крычаўскай дзяржавы ўпамінаецца ў судовых актах 1601 г.. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Раей. У 1780 г. сяльцо, 9 двароў, 55 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1912 г. адкрыта земская школа, якая размясцілася ў наёмным памяшканні. У 1918 г. на базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, якая размясцілася ў маёнтку Языпава, у былым памешчыцкім доме і ў 1925 г. налічвала 40 вучняў. У 1926 г. 61 двор, 318 жыхароў. У1930 г. арганізаваны калгас імя Кірава. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 60 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік», з 1981 г. – «Сацыялістычны шлях». На Г 1.2003 г. 44 двары, 94 жыхары.

**ДУБРАЎКА,** пасёлак, за 16 км на поўнач ад Крычава, 120 км ад Магілёва, 11 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядомы па пісьмовых крыніцах з XIX ст. Гаспадар маёнтка, які быў тут, валодаў у 1851 г. 352 дзесяцінамі зямлі. У 1897 г. вёскі Дуброўка-1 (2 двары, 13 жыхароў), Дуброўка-2 (3 двары, 18 жыхароў) і ваколіца (2 двары, 11 жыхароў). У 1909 г. засценак Дуб-

роўка-1 (5 двароў, 43 жыхары) і засценак Дуброўка-2 (4 двары, 61 жыхар) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Уваходзілі ў Кашанскі праваслаўны прыход. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

**ЗАЛЕССЕ,** вёска, за 13 км на поўнач ад Крычава, 177 км ад Магілёва, 8 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

У 1923 г. у выніку перасялення на былыя памешчыцкія землі жыхароў з в. Бель-1 былі ўтвораны пасёлкі Залескі-1 і Залескі-2. У 1930 г. арганізаваны калгас імя С.М. Будзённага, які з 1931 г. абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У канцы 1930-х гадоў пасёлкі аб'яднаны ў в. Залессе. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 23 жыхары.

**ЗУІ,** вёска, за 8 км на поўнач ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1604 г. сяло Зуі Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1747 г. 8 двароў, меліся карчма, млын, дзяржаўная ўласнасць, у Крычаўскім старостве. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) ў складзе Расіі. У 1779 г. 15 двароў, 67 жыхароў. У 1926 г. 37 двароў, 205 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны араты». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фапіысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Ленінскі заклік». З 1981 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 87 двароў, 208 жыхароў.

**ІВАНАЎКА** (да 1919 г. Свіная), вёска, цэнтр калгаса «Сацыялістычны шлях», за 8 км на поўнач ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1604 г. як вёска Свіная Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. З 1667 г. у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У выніку ваенных дзеянняў вайны 1654 –1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай была спустошана. У 1709 г. з меўшыхся ў вёсцы 3 валок зямлі апрацоўвалося толькі 1/3 частка. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1909 г. 29 двароў 268 жыхароў і ваколіца (52 двары, 544 жыхары). Побач быў маёнтак Прысмыцкага, якому належала большая частка вясковай зямлі. Меліся школа і карчма.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1918 г. на ўшанаванне памяці ўраджэнца вёскі – данецкага шахцёра Івана Лазаравіча Паршукоўскага, які ў 1907 г.за рэвалюцыйную дзейнасць у Кацярынаславе быў расстраляны, вёску назвалі Іванаўкай. На будынку клуба ўстаноўлена мемарыяльная дошка ў памяць аб рэвалюцыянеру-земляку. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 180 вучняў. Дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 125 двароў 725 жыхароў. У 1931 г. быў арганізаваны калгас «Чырвоны араты», працавалі 2 кузні.

У снежні 1953 г. вёскі Іванаўка, Гарбатка, Зуі, Глушнёва, Варанёва (не існуе) увайшлі ў калгас «Ленінскі заклік». На 1.1.2003 г. 175 двароў, 438 жыхароў.

**КАШАНЫ,** вёска, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1. На поўнач ад вёскі цячэ р. Чорная Натапа (прыток р.Сож).

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1777 г. вёска ў Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. сяло (52 двары, 308 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1804 г. адбылося хваляванне еялян. У 1854 г. пабудавана царква. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882 г.). У 1900 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1902 г. навучалася 100 хлопчыкаў. У 1909 г. 75 двароў, 529 жыхароў 754 дзесяціны зямлі, у Кашанскім сельскім таварыстве ў Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. На валасным сходзе 18.06.1919 г. вяскоўцы заявілі аб гатоўнасці па першаму закліку рабоча-сялянскай улады выступіць на абарону савецкай рэс-

публікі. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені,у якой у 1925 г. быў 61 вучань з вёсак Кашаны, Баяры, пасёлкаў Зялёная Дубрава, Зялёны Гай, Падбаяры, Паддуб'е, Зялёны Дуб, Дубраўка і навакольных хутароў. Дзейнічала бібліятэка. У 1926 г. 124 двары, 660 жыхароў. У тым жа годзе створана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства. У 1930 г. арганізаваны калгас «Іскра», працавалі кузня і ваўначоска, дзейнічаў фельчарска-акушэрскі пункт. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя К.Маркса. На 1.1.2003 г. 24 двары, 64 жыхары.

**ЛАБКОВІЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета (з 16.07.1954) і калгаса імя К. Маркса, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілё- ва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XV ст. Князь Юрый Мсціслаўскі падараваў у першай палове XV ст. «бабровыя гоні ад Малатамлі да Лабкоўскага рубяжу» Андрыеўскаму манастыру. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1701 г. у Мсціслаўскім ваяводстве. У XVII–XVIII ст. сяло ў Крычаўскім старостве. У Паўночную вайну разрабавана і спустоша- на шведамі. У 1709 г. з наяўных 20 надзелаў зямлі апрацоўваліся толькі тры. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) у складзе Расіі. У 1779 г. 32 двары, 242 жыхары, у Крычаўскім старостве. З 1810 г. да адмены прыгоннага права (1861) ваеннае (аракчэеўскае) пасяленне, а вяскоўцы – ваенныя пасяленцы, з якіх камплектаваліся вайсковыя часці. У 1880 г. 50 двароў 329 жыхароў. Апрача земляробства, жыхары займаліся кравецкай справай. Мелася кузня. У 1902 г. пабудаваны будынак і пачала дзейнічаць царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. 85 двароў 774 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1923 г. у выніку перасялення часткі жыхароў гэтай вёскі былі паблізу ўтвораны пасёлкі Клевер, Прагрэс, Нікалаеўка, Слабада, якія зараз не існуюць. У вясковай школе ў 1926 г. было 72 вучні, а ў вёсцы – 57 двароў, 730 жыхароў. У1931 г. арганізаваны калгасы імя М.С.Будзённага, «Ударнік» і «Парыжская камуна», якія ў 1934 г. аб'ядналіся ў адну гаспадарку «17-ы партз'езд». З 1930 г. у вёсцы працаваў вапнавы завод імя В.М. Молатава (5 рабочых). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія ў 1943 г. амаль поўнасцю спалілі вёску. Вызвалена 30.09.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. На ўшанаванне памяці 384 жыхароў вёсак сельсавета, якія загінулі на франтах і ў партызанскай барацьбе, у 1982 г. у цэнтры вёскі пастаўлены абеліск з імёнамі загінуўшых.

Радзіма дзяржаўнага дзеяча БССР К.В. Кісялёва і аднаго з актыўных кіраўнікоў камсамола Беларусі ў гады Вялікай Айчынай вайны, рэдактара падпольных газет «Звязда» і «Чырвоная змена», журналіста М.П. Барашкава. На 1.1.2003 г. 295 двароў, 695 жыхароў.

**ЛІПАЎКА,** пасёлак, за 18 км на поўнач ад Крычава, 122 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1930-х гадах у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіў у Кашанскі сельсавет Крычаўскага раёна. Пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

**НІЗКІ,** вёска, за 12 км на паўночны захад ад Крычава, 97 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 1 двор, 8 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Памешчык меў у 1876 г. у вёснах Нізкі і Міхалін 2000 дзесяцін зямлі. З 1897 г. фальварак, 7 двароў, 65 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1909 г. пасёлак (20 двароў, 112 жыхароў) і маёнтак (34 жыхары), 400 дзесяцін зямлі, належаў У.У.Васілеўскаму, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Дзейнічала 4-класная школа. У 1926 г. 43 двары, 281 жыхар. У 1930 г. арганізаваны калгас «Камінтэрн», працавалі кузня па рамонту сельскагаспадарчага інвентару і маслазавод. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да

1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 24 двары, 57 жыхароў.

**ПАДАСІНКІ,** пасёлак, за 8 км на паўночны захад ад Крычава, 96 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1930-х гадах вяскоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1981 г. у складзе калгаса «Сацыялістычны шлях». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 43 жыхары.

**ПАЛАНІЦА,** вёска, за 12 км на паўночны захад ад Крычава, 92 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Па пісьмовых крыніцах вядомаз 1560 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, валоданне шляхціча. Мелася царква. У 1586 г. сяло Мсціслаўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1678 г. маёнтак у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 38 двароў 228 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1816 г. 35 двароў, 204 жыхары. У 1882 г. пабудавана з дрэва царква. Меўся хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882). У 1898 г. пачала працаваць царкоўнапрыходская школа, памяшканне для якой пабудавана ў тым жа годзе. У 1909 г. 60 двароў 356 жыхароў, 430 дзесяцін зямлі, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. На базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені імя У.І. Леніна, у якой у 1925 г. было 65, а ў 1926 г. 96 вучняў з вёсак Паланіца, Брадок і навакольных хутароў. З 1925 г. дзейнічалі хата-чытальня і гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У вёсках Паланіцкага сельсавета працавалі 3 пачатковыя школы (акрамя Паланіцкай), 3 ветраныя млыны, кааператыўная лаўка. У 1926 г. 92 двары, 511 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны май», працавала кузня. Абслугоўвала калгас Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у калгасе «Камінтэрн». З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 14 жыхароў.

**ПЕСЬКАВІЧЫ,** вёска, за 11 км на поўнач ад Крычава, 93 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1604 г. як сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1747 г. 2 двары, у Крычаўскім старостве. У 1780 г. сяльцо, 10 двароў, 55 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Мясцовы памешчык меў тут у 1841 г. 120 дзесяцін зямлі. У 1926 г. 18 двароў, 105 жыхароў. У 1930-я гады вяскоўцы стварылі калгас. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Лабковіцкім сельсавеце. З 1950 г. у калгасе імя Сталіна, зараз у складзе гаспадаркі імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 30 жыхароў.

**ПАЎЛАВІЧЫ,** вёска, за 10 км на поўнач ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. З 1811 г. у Чэрыкаўскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. З 1880 г. непадалёку ад вёскі былі 2 невял ікія маёнткі. У 1897 г. 24 двары, 195 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1921 г. было 39 вучняў. У 1926 г. 41 двор, 223 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны прамень», які з 1931 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1962 г. у складзе калгаса імя XXII з'езда КПСС. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 24 жыхары.

**СТАБОРШЧЫНА,** вёска, за 24 км на поўнач ад Крычава, 128 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р.Чорная Натапа захаваўся старажытны могільнік, за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі – старажытны курган, якія сведчаць аб засяленні гэтых мясцін у далёкай старажытнасці.

Па пісьмовых крыніцах вядома з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. Непадалёку з 1850 г. быў маёнтак. У 1897 г. вёска (4 двары, 25

жыхароў) і ваколіца (7 двароў, 45 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Уваходзіла ў Кашанскі праваслаўны прыход. У 1926 г. 18 двароў, 109 жыхароў, у 1930 г. арганізаваны калгас «Праца». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса імя К.Маркса. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

**СТАРАСЕЛЛЕ,** вёска, за 22 км на поўнач ад Крычава, 126 км ад Магілёва, 17 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. У 1708 г. 40 двароў, 287 жыхароў, належала казённай палаце. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1897 г. у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў лістападзе 1917 г. У 1926 г. адкрыта школа (41 вучань). У 1931 г. арганізаваны калгасы «Камінтэрн» і імя К. Маркса, якія ў хуткім часе аб'ядналіся ў адну гаспадарку – імя К. Маркса, мелася кузня. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Цяпер у складзе калгаса імя К. Маркса. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 29 жыхароў.

## МАЛЯЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

**БРОДАК,** вёска, за 18 км на паўночны захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 12 двароў, 145 жыхароў. У1897 г. 42 двары, 279 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1926 г. 68 двароў, 342 жыхары. У 1930 г. арганізаваны калгас «Звязда», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 54 гаспадаркі. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 39 жыхароў.

**ВУЗКАЯ,** вёска, за 20 км на паўночны захад ад Крычава, 84 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша – Клімавічы.

Заснавана ў 1920-х гадах перасяленцамі з суседніх вёсак. У 1930-х гадах вяскоўцы аб'ядналіся ў калгас. У 1940 г. 55 двароў, 241 жыхар. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы ў верасні 1943 г. спалілі 51 двор. Пасля вайны адбудавана. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 34 двары, 51 жыхар.

**ЕРМАКОЎКА,** вёска, за 18 км на паўночны захад ад Крычава, 86 км ад Магілёва, 7 км ад чыгуначнай станцыі Маляцічы на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст., у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1780 г. 20 двароў, 88 жыхароў. У 1834 г. 140 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 31 двор, 159 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. 39 двароў, 274 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні.

У 1919 г. адкрыта працоўная школа 2-й ступені, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у школе было 30 вучняў, дзейнічаў драматычны гурток. У 1926 г. 65 двароў, 275 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ленінскія дні», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 46 гаспадарак, абслугоўваўся Крычаўскай МТС. У ліпені 1941 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У ноч з 25 на 26 жніўня 1942 г. партызаны атрада «Алеся» непадалёку ад вёскі ўзарвалі варожы эталон. Быў знішчаны паравоз і 13 вагонаў, 350 гітлераўцаў. Вызвалена 30.09.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. Зараз у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». Радзіма Героя Савецкага Саюза А.Я. Смалякова. На 1.1.2003 г. 51 двор, 126 жыхароў.

**ЛУТЫ,** вёска, цэнтр калгаса «Вялікі Кастрычнік», за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 129 км ад Магілёва, 13 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша—Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай

(1772) у складзе Расіі, у Чэрыкаўскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1890 г. 8 двароў, 78 жыхароў. У1834 г. 111 жыхароў уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога ў 1877 г. валодаў 100 дзесяцінамі зямлі, меў карчму. У 1897 г. 21 двор, 143 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. У 1918 г. у былым маёнтку створана камуна «Рассвет». У 1919 г. адкрыта школа (у 1926 – 52 вучні), а ў 1925 для яе пабудавана памяшканне. У 1926 г. 49 двароў 228 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Вялікі Кастрычнік», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 26 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**МАЛЯЦІЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета (з 20.08.1924) і калгаса «Запаветы Леніна», за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 129 км ад Магілёва, 16 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з 1643 г. як сяло Малецічы, уласнасць памешчыка, меўся касцёл. У 1639 г. 13 двароў, 28 жыхароў дзяржаўная ўласнасць. У 1684 г. цэнтр маёнтка і воласці, у пачатку XVIII ст. мястэчка ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У Паўночную вайну ў канцы жніўня 1708 г. непадалёку ад вёскі, на р.Чорная Натапа, расійская армія пад камандаваннем М.М. Галіцына разграміла авангард шведскай арміі. Шведы страцілі 3 тыс. забітымі, 3 тыс. параненымі. Гэта была першая перамога рускіх войск над шведамі, а праз месяц шведскія войскі былі разгромлены пад Лясной. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) цэнтр воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Належала архіепіскапу, потым мітрапаліту Станіславу Сестранцэвічу-Богушу, затым удаве генерал-маёра Багушэўскага. Упамінаецца як мястэчка ў статыстычным апісанні губерні ў 1784 г. У 1780 г. 40 двароў, 255 жыхароў. У 1797 г. дзейнічаў дамініканскі кляштар, у валоданні якога было сяло Людагошч. У 1811 г. мястэчка, уласнасць касцёла. Прыкметным архітэктурным збудаваннем таго часу быў пабудаваны з цэглы на сродкі ўладальніка мястэчка Сестранцэвіча касцёл, які ўяўляў сабой копію вядомага сабора Св. Пятра ў Рыме, паменшаную ў 32 разы. У 1835 г. гэты касцёл пераўтвораны ў праваслаўную царкву. У Айчынную Вайну 1812 г. мястэчка часткова спалена. У 1848 г. 32 двары, валоданне каталіцкага архіепіскапа. Побач знаходзіўся аднайменны фальварак, у якім у 1858 г. 29 двароў 92 жыхары. Памешчык меў у 1859 г. 1334 дзесяціны зямлі, вадзяны млын, піцейны дом. У 1863 г. у мястэчку налічвалася 213 жыхароў. У 1879 г. адкрыта школа (народнае вучылішча), у якой у 1889 г. навучалася 55 хлопчыкаў і дзве дзяўчынкі. У 1880 г. у мястэчку 62 двары, 327 жыхароў (155 мужчынскага, 172 жаночага полу), у тым ліку 188 праваслаўных, меліся вадзяны млын, сукнавальня, лячэбніца (адкрыта не пазней 1880 г.), 10 лавак, мураваная царква, малітоўная школа. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. у мястэчку 61 двор, 386 жыхароў, паштовая станцыя, хлебазапасны магазін, 34 лаўкі, у сяле 39 двароў, 270 жыхароў, у фальварку 3 двары, 33 жыхары, вадзяны млын. Штогод 29 чэрвеня, у дзень Св. Пятра і Паўла, у мястэчку праводзіўся кірмаш. У час першай расійскай рэвалюцыі адбываліся ў 1905 г. сутычкі сялян з паліцыяй.

У 1918 г. створаны партыйная ячэйка і камбед. На базе дарэвалюцыйнай адкрылася ў сяле працоўная школа 2-й ступені, у мястэчку – працоўная школа 1-й ступені. Панская зямля была падзелена паміж сялянамі, дом мясцовага памешчыка Палонскага быў аддадзены пад Народны дом, а затым – пад школу. У ліпені 1918 г. адкрыты дзіцячы сад і 4 дзіцячыя пляцоўкі. У 1921 г. адкрыта хата-чытальня. 21.02.1921 г. створана сельскагаспадарчае крэдытнае таварыства, а 2.11.1923 г. – кааператыўнае таварыства. У 1923 г. у мястэчку і сяле 844 жыхары. У 1924 г. адкрыта бальніца. У 1925 г. пачалі дзейнічаць аддзяленне сувязі і ветэрынарны пункт, у сямігадовай школе навучаліся дзеці з вёсак Маляцічы, Шчарбачы, Шаеўка, Сарочына, Славуты, пасёлкаў Швецкая Горка, Цалавальнік і навакольных хутароў, а таксама лясніцтва. У 1926 г. у сяле 78 двароў, 379 жыхароў, у мястэчку 84 двары, 320 жыхароў. У1928 г. адкрыты школьны інтэрнат. У пачатку 1930-х гадоў арганізаваны калгасы «Новае жыццё» (у 1932 г. аб'ядноўваў 32 гаспадаркі) і «Чырвоны араты» (у

89. Зак. 808.

1932 г. аб'ядноўваў 31 гаспадарку). У 1935 г. працавалі конная крупарушка (заснавана ў 1923 г.), 3 кузні, 2 ваўначоскі, шавецкая арцель. У 1936 г. пабудаваны сельмаг. У 1940 г. 97 двароў, 502 жыхары. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1942 г. гітлераўцы загубілі 75 жыхароў а ў верасні 1943 г. спалілі вёску, знішчылі 210 жыхароў. Вызвалена 1.10.1943 г. войскамі 50-й арміі Бранскага фронту. Пасля вайны адбудавана. На 1.1.2003 г. 176 двароў, 402 жыхары.

**МІРНАЯ** (да 30.07.1964 г. Глупікі-1 і Глупікі-2), вёска, за 20 км на паўночны захад ад Крычава, 84 км ад Магілёва, 15 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) адыйшла да Расіі. У 1758 г. маёнтак і вёска Глупікі ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У 1780 г. сяльцо Глупікі (17 двароў 77 жыхароў) і сяльцо Глупікі Каменскіх (21 двор, 120 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1834 г. 184 жыхары, уласнасць памешчыка, непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1850 г. 176 дзесяцін зямлі, аў 1872 г. 160 дзесяціну вёсках Глупікі і Ануфрыева. Дзейнічаў хлебазапасны магазін (адкрыты не пазней 1882 г.). У 1897 г. вёскі Глупікі-1 (45 двароў, 289 жыхароў) і Глупікі-2 (28 двароў, 161 жыхар) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Меліся 4 ветраныя млыны. У 1909 г. у в. Глупікі-1 50 двароў, 241 жыхар, а ў в. Глупікі-2 30 двароў 184 жыхары. У фальварку Глупікі 1 двор, 8 жыхароў. У 1909 г. адкрыта школа (народнае вучылішча).

Пасля ўстанаўлення Савецкай ўлады на базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, якая атрымала нацыяналізаваны будынак (у 1925 г. 64 вучні). У 1926 г. у в.Глупікі-1 58 двароў, 334 жыхары, в. Глупікі-2 58 двароў, 331 жыхар. У 1931 г. арганізаваны калгасы «Чырвоная Горка» (у 1932 г. 13 гаспадарак) і «Чырвоны Барацьбіт» (у 1932 г. 52 гаспадаркі). Працаваў заснаваны ў 1923 г. паравы млын. Абслугоўвала калгасы Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля вайны ў калгасе імя Кірава, з 1959 г. у складзе калгаса «Вялікі Кастрычнік». На 1.1.2003 г. 87 двароў, 216 жыхароў.

**МЫШКАВІЧЫ,** вёска, за 25 км на паўночны захад ад Крычава, 79 км ад Магілёва, 16 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l на лініі Орша–Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1768 г. вёска і маёнтак Мышкавічы ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. 3 1772 г. у складзе Расіі. У 1780 г. у вёсцы Вялікія Мышкавічы 20 двароў, 92 жыхары, належала архіепіскапу, потым мітрапаліту С. Сестранцэвічу-Богушу, у пачатку XIX ст. – памешчыку С.Р. Мацкевічу, затым яго жонцы. Памешчык меў у 1881 г. 208 дзесяцін зямлі. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім рамяством. У 1897 г. вёскі Вялікія Мышкавічы (28 двароў, 176 жыхароў), Малыя Мышкавічы (3 двары, 32 жыхары) і ваколіца Мышкавічы (3 двары, 17 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Была створана працоўная школа 1-й ступені (у 1921 г. 48 вучняў). Вёскі Мышкавічы Вялікія і Мышкавічы Малыя ў першай палове 1920-х гадоў зліліся ў адну вёску. У школе навучаліся дзеці з вёсак Мышкавічы і Антонаўка. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. у вёсцы – 51 двор, 276 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас «Перамога». У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 25 двароў 35 жыхароў.

**ПЛЕШЧЫНА,** вёска, за 17 км на поўнач ад Крычава, 121 км ад Магілёва, 12 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. як вёска ў складзе маёнтка Маляцічы, у Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1780 г. 14 двароў, 81 жыхар, належала С. Сестранцэвічу-Богушу. У 1834 г. 68 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце. У 1858 г. 12 двароў, 71 жы-

хар, уласнасць памешчыка. Дзейнічаў вадзяны млын. Частка вяскоўцаў займалася кравецкім промыслам. У 1897 г. 20 двароў, 143 жыхары, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1918 г. адкрыта школа, у якой у 1925 г. было 47 вучняў з вёскі Плешчына і пасёлкаў Селішча, Ліпаўка, Малееўка, Ракаўка. У 1926 г. 38 двароў, 205 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны лётчык». У 1940 г. 50 двароў, 249 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 43 двары, загубілі 6 жыхароў. Пасля вайны адбудавана. Да 1962 г. у складзе калгаса «Іскра». З 1962 г. у калгасе «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 9 двароў, 12 чалавек.

**САРОЧЫНА**, вёска, за 26 км на паўночны захад ад Крычава, 78 км ад Магілёва, 18 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-1 на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVII ст. сяло Сарочын, уласнасць памешчыка. У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) увайшла ў склад Расіі. У 1816 г. 8 двароў, 20 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце, у 1847 г. у складзе маёнтка Слабут Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Гаспадар маёнтка меўу 1850 г. у вёсках Сарочына і Слабуты 200 дзесяцін зямлі. У 1897 г. сяло (27 двароў, 212 жыхароў) і хутар (1 двор, 14 жыхароў) у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета.

У 1920 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, для якой у 1927 г. пабудавана памяшканне. У 1926 г. 45 двароў, 238 жыхароў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1930 г. арганізаваны калгас «Савецкая Беларусь», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 16 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 1.10.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе калгаса «Запаветы Леніна».

**СЛАБУТЫ**, вёска, за 27 км на паўночны захад ад Крычава, 77 км ад Магілёва, 20 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-l на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., фальварак, меўся млын. У 1780 г. сяльцо, 14 двароў, 138 жыхароў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. З 1772 г. у складзе Раей. У 1847 г. цэнтр маёнтка Слабут у Чэрыкаўскім павеце, гаспадар якога меў у 1850 г. 200, а ў 1858 г. – 274 дзесяцін зямлі. У студзені 1931 г. арганізаваны калгас імя І.В. Сталіна, які ў 1932 г. аб'яднoўваў 29 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 1950 г. у складзе калгаса «Запаветы Леніна». На 1.1.2003 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

## ЧЫРВАНАБУДСКІ СЕЛЬСАВЕТ.

**ДЗЯГАВІЧЫ,** вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст., сяло ў Крычаўскім старостве Мсціслаўскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1779 г. 48 двароў, 257 жыхароў, у Крычаўскім старостве Клімавіцкага павета, уласнасць памешчыка. Непадалёку быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1830 г. урозных месцах 9341,5 дзесяцін зямлі, меў 2 вадзяныя млыны. У 1850 г. 68 двароў, 179 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1885 г. 82 двары, 530 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Побач быў аднайменны фальварак (1 двор, 11 жыхароў). У 1905 г. адкрыта казённая вінная лаўка. У 1909 г. 128 двароў, 843 жыхары, у фальварку 2 двары, 9 жыхароў, 1689 дзесяцін зямлі. Уласнасць І.С. Галынскага. Мелася карчма. У 1912 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1925 г. у вясковай школе было 63 вучні: дзеці з вёсак Дзягавічы, Нанаскаў, бліжэйшых хутароў. У 1926 г. 208 двароў, 1335 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы арганізавалі калгас «Май», які ў 1932 г. аб'яднoўваў 64 гаспадаркі. Працавалі ветраны млын (з 1922 г.), рымарная майстэрня, кузня. У 1939 г. з бліжэйшых хутароў у вёску было сселена 132 двары. У Вялікую

Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 3 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы А.І. Манінай. На 1.1.2003 г. 102 двары, 475 жыхароў.

**ЗАРУБЕЦ,** вёска, за 19 км на паўночны ўсход ад Крычава, 123 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1880-х гадах вядомы маёнтак, 6 мясцовых памешчыкаў мелі тут у 1878 г. 872 дзесяціны зямлі. У 1897 г. латышскае пасяленне Зарубец (яно ж Навіна) налічвала 17 двароў 115 жыхароў, уваходзіла ў Хатовіжскую воласць Клімавіцкага павета. Побач быў фальварак Зарубец (1 двор, 19 жыхароў, ветраны млын). У 1914 г. яшчэ 36 сем’яў з Магілёўскай і Чарнігаўскай губерняў у пошуках лепшага жыцця аселі ў тутэйшых мясцінах.

У 1921 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавалі памяшканне, а ў 1925 г. было 48 вучняў. Першым старшынёй сельсавета быў У. Маталыгін. У першай палове 1920-х гадоў адкрыты магазін, хата-чытальня. У 1926 г. 66 двароў, 415 жыхароў. У 1929 г. арганізаваны калгасы «Новае жыццё» і «Чырвонае Сормава» (у 1923 г. аб’ядноўваў 42 гаспадаркі). 3 1931 г. калгасы абслугоўвала Крычаўская МТС. Пазней калгасы аб’ядналіся ў адзін з назвай «Чырвонае Сормава». Была амбулаторыя. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На 1.1.2003 г. 70 двароў, 143 жыхары.

**КАЛЕКТЫЎНЫ ТРУД,** вёска, за 18 км на ўсход ад Крычава, 177 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Заснавана ў пачатку 1920-х гадоў на былых памешчыцкіх землях. У 1926 г. калектыўная гаспадарка, 18 двароў, 132 жыхары. У 1930-я гады каля вёскі працавала торфапрадпрыемства (у 1940 г. 189 рабочых), якое забяспечвала палівам Крычаўскі цэментны завод. У 1940 г. 20 двароў, 200 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 4 жыхароў. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». У 1948 г. абсталяваны радыёвузел, вёска была радыёфікавана, а крыху пазней электрыфікавана. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 8 жыхароў.

**КАМЕНКА,** вёска, за 8 км на паўднёвы ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XIX ст. У 1816 г. вёска (22 двары, 178 жыхароў) у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 г. 32 двары, 240 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. Меліся 2 ветраныя млыны. У 1914 г. адкрыта школа граматы. На базе дарэвалюцыйнай была адкрыта працоўная школа 1-й ступень У 1926 г. 75 двароў, 371 жыхар. У 1930 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Сцяг», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 78 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 3 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце. 3 1957 г. у складзе саўгаса «Крычаўскі».

Недалёка ад вёскі знаходзіцца радовішча крэйды і мергелю (разведаныя запасы 46 млн т), якое распрацоўваецца Крычаўскім цэментна-шыферным камбінатам. На 1.1.2003 г. 22 двары, 32 жыхары.

**КАРАНЕЦ,** вёска, за 11 км на ўсход ад Крычава, 115 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Міхеевічы на лініі Орша – Клімавічы.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1897 г. 70 двароў 376 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1901 г. адкрыта школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. У 1909 г. 136 двароў, 992 жыхары. На базе дарэвалюцыйнай школы створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1925 г. было 65 вучняў. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. 17.09.1922 г. створана саматужна-прамысловая арцель «Пралетарый», 11.06.1923 г. арганізавана закупачна-збытавое таварыства, а 24.11.1924 г. – сельгаставарыства, якое забяспечвала сялян насеннем траў, вяло на-

рыхтоўку сельскагаспадарчых прадуктаў, абслугоўвала 2 вёскі, 15 пасёлкаў. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвоны партызан», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 64 гаспадаркі. Мелася кузня, працаваў торфазавод «Калектыўная праца». У 1940 г. 100 двароў, 500 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі вёску. Пасля вайны адбудавалася. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 22 двары, 33 жыхары.

**КРАСНАПОЛЛЕ,** пасёлак, за 12 км на ўсход ад Крычава, 116 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаўль.

Заснаваны у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У Вялікую Айчынную вайнузліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 20 двароў, 34 жыхары.

**ЛІЦВІНАВА,** вёска, за 8 км на паўночны ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Узнікла ў 1930-х гадах у выніку перасялення сялян з бліжэйшых хутароў, уваходзіла ў Міхеевіцкі сельсавет Крычаўскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1954 г. у Чырванабудскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 30 двароў, 47 жыхароў.

**МІХЕЕВІЧЫ,** вёска і чыгуначная станцыя на лініі Орша – Клімавічы, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1586 г. як сяло ў Крычаўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1604 г. сяло Крычаўскай дзяржавы, казённая ўласнасць. Выхадцы з вёскі былі ў XVII ст. вядомымі майстрамі пушкарскай справы. У 1779 г. 36 двароў 240 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. Недалёка быў маёнтак, гаспадар якога валодаў у 1830 г. 9341,5 дзесяціны зямлі, меў 2 вадзяныя млыны. У 1834 г. 58 двароў, 249 жыхароў. У 1857 г. заснавана сукнавальня. У 1880 г. 62 двары, 341 жыхар. Частка вяскоўцаў займалася калёсным рамяством. У 1897 г. 81 двор, 506 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета. Меліся вадзяны млын, школа граматы, піцейны дом, у аднайменным фальварку, што быў побач, 10 двароў, 115 жыхароў. У 1904 г. адкрыта земская школа, для якой у тым жа годзе пабудавана памяшканне. На базе дарэвалюцыйнай школы адкрыта школа l-й ступені, у якой у 1926 г. было 56 вучняў. У 1926 г. 110 двароў 686 жыхароў. У 1927 г. для школы пабудавана новае памяшканне. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Колас», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 62 гаспадаркі. У час калектывізацыі кулакі загубілі камсамолку Д. Пасканную. З сярэдзіны 1930-х гадоў працавала хлебапякарня, дзейнічаў фельчарскі пункт. У 1940 г. 120 двароў 310 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы спалілі 85 двароў. Пасля вайны вёска адбудавана.

Недалёка ад вёскі знаходзіцца радовішча цэментнай крэйды (разведаныя запасы 85,6 млн т). На 1.1.2003 г. 93 двары, 191 жыхар.

**НАНАСКАВА,** вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У1811 г. 3 двары, 18 жыхароў, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1850 г. 5 двароў, 26 жыхароў. У 1897 г. 12 двароў, 81 жыхар, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні.

У пачатку 1920-х гадоў адкрыта працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 24 вучні. Дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1926 г. 24 двары, 127 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Асцёр», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 10 гаспадарак. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З 16.07.1959 г. у Чырванабудскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

**ПРАХОРАЎКА,** вёска, за 9 км на паўночны ўсход ад Крычава, 113 км ад Магілёва, 3 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. У 1747 г. 11 двароў, дзяржаўная ўласнасць. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1779 г. 19 двароў, 130 жыхароў уласнасць памешчыка. Частка вяскоўцаў займалася калёсным і кавальскім рамёствамі. У 1897 г. 35 двароў, 256 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні.

1.1.1925 г. адкрыта чатырохгадовая школа, у якой было 45 вучняў, а ў 1927 г. для школы пабудавана памяшканне, мелася бібліятэка. На пачатку 1925 г. у вёсках Прахораўскага сельсавета працавалі 5 школ, 4 кааператыўныя лаўкі, вадзяны і 3 ветраныя млыны, 3 кузні і прыватная лаўка. У 1926 г. 67 двароў, 409 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас «Ударнік», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 32 гаспадаркі.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

За 2,2 км на паўднёвы захад ад вёскі знаходзіцца радовішча пясчана-жвіравога матэрыялу (разведаныя запасы 503 тыс. $м^3$). На 1.1.2003 г. 26 двароў, 52 жыхары.

**ПРУДОК,** вёска, за 4 км на ўсход ад Крычава, 108 км ад Магілёва, 6 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1816 г. 13 двароў, 77 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1873 г. заснавана сукнавальня. У 1897 г. 9 двароў, 54 жыхары,у Крычаўскай воласці Чэрыкаўскага павета. Меліся вадзяны млын і сукнавальня. У 1930 г. арганізаваны калгас «Ударнік», які з 1933 г. абслугоўвала Крычаўская МТС. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За 0,9 км на паўночны захад ад вёскі гітлераўцы загубілі звыш 1200 савецкіх грамадзян – вязьняў Крычаўскага лагера смерці, партызан і дзяцей-заложнікаў (каля 100 чалавек). У ліку ахвяр удзельнікі Крычаўскага падполля: вядомы спявак А.І. Акаёмаў і галоўны хормайстар Маскоўскай філармоніі Г.П. Лузенін. Зараз вёска ў складзе калгаса «Крычаўскі». За 0,8 км на паўночны ўсход ад вёскі знаходзіцца радовішча пясчана-жвіровага матэрыялу (разведаныя запасы 276 тыс.$м^3$). На 1.1.2003 г. 24 двары, 57 жыхароў.

**СЯРЭБРАНЫ РУЧАЙ** (да 1937 г. Круты Роў), пасёлак, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 1 двор, 4 жыхары.

**ЧЫРВОНЫ БОР,** пасёлак, за 10 км на ўсход ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Узнік у 1920-х гадах на былых памешчыцкіх землях. У 1924 г. адкрыта 4-гадовая школа, у якой у 1925 г. было 35 вучняў. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 1 жыхар.

**ЧЫРВОНАЯ БУДА** (да 1935 Жыдава Вуда), вёска, цэнтр сельсавета з 16.07.1954 і саўгаса «Крычаўскі», за 10 км на ўсход ад Крычава, 114 км ад Магілёва, 2 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў—Рослаў.

Вядома па пісьмовых крыніцах з XVIII ст. як сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, мелася карчма. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расіі. У 1816 г. 24 двары, 92 жыхары, у Клімавіцкім павеце, уласнасць памешчыка. Недалёка быў маёнтак, гаспадар якога меў у 1874 г. у вёсках Жыдава Буда і Сярэбраны Ручай 300 дзесяцін зямлі, млын. Тут дзейнічалі дзягцярна-бяроставае прадпрыемства і лаўка. У 1883 г. 32 двары, 159 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета. У 1897 г. 26 двароў 189 жыхароў. У 1904 г. заснаваны вінакурны завод. Побач быў фальварак (1 двор, 25 жыхароў). У 1919 г. адкрыта працоўная школа 1-й ступені, якой быў пера- дадзены памешчыцкі дом (у 1926 – 45 вучняў). У 1926 г. 54 двары, 332 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоная Буда», які ў 1932 г. аб’ядноўваў 36 гаспадарак. У 1940 г. 38 двароў, 250 жыхароў. У Вя-

лікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы ў верасні 1943 г. спалілі 31 двор, загубілі 7 жыхароў. У час акупацыі дзейнічала камсамольская антыфашысцкая трупа пад кіраўніцтвам А. Крупадзёрава. У цэнтры вёскі, каля шашы Крычаў – Рослаў у 1979 г. пастаўлена стэла ў памяць аб юных падпольнчыках трупы, якія ў 1943 г. загінулі ад рук фашыстаў. З 1950 г. у калгасе «Чырвоны партызан», з 1957 г. у саўгасе «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 325 двароў, 707 жыхароў.

**ЧЫРВОНЫ САД,** пасёлак, за 8 км на ўсход ад Крычава, 112 км ад Магілёва, 4 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

Заснаваны у 1920-х гадах перасяленцамі з суседніх вёсак. З 20.08.1924 г. у Міхеевіцкім сельсавеце Крычаўскага раёна. У 1930-х гадах пасялкоўцы ўступілі ў калгас. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 30.09.1943 г. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зараз у складзе саўгаса «Крычаўскі». На 1.1.2003 г. 6 двароў, 13 жыхароў.

**ЯГОРАЎКА,** вёска, за 15 км на паўночны ўсход ад Крычава, 119 км ад Магілёва, 5 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў-2 на лініі Крычаў – Рослаў.

За 4 км на ўсход ад вёскі, на нізкім забалочаным поплаве левага берага р. Асцёр захавалася гарадзішча ранняга жалезнага веку і позняга сярэднявечча, за 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі – старажытны могільнік (7 насыпаў), што сведчыць аб засяленні гэтых мясцін у глыбокай старажытнасці. Па пісьмовых крыніцах вядома з XIX ст. У 1880 г. вёска Слабодка-Ягораўка, 12 двароў, 84 жыхары. Частка вяскоўцаў займалася ганчарным рамяством. У 1897 г. 19 двароў, 111 жыхароў, у Хатовіжскай воласці Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. У 1926 г. 22 двары, 133 жыхары. У 1931 г. арганізаваны калгас «Чырвоны Бор», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 17 гаспадарак. У 1940 г. 25 двароў, 100 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У верасні 1943 г. гітлераўцы поўнасцю спалілі вёску, загубілі 4 жыхароў. Пасля вызвалення адбудавана. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 7 жыхароў

Падрыхтаваў да друку
*У.У.Бянько.*

# Аб старадаўнім Крычаве

Нядаўна ў выдавецтве «Беларуская навука» выйшла кніга А.А. Мяцельскага «Старадаўні Крычаў» (гісторыка-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст.). Гэта работа – важкі ўклад даследчыка ў беларускую гістарыяграфію. Вельмі карысна, што аўтар прысвяціў сваю кнігу аднаму з «малых» гарадоў сярэднявечча – Крычаву. Кожны, хто пазнаёміцца з выданнем, адкрые для сябе шмат цікавага. Каштоўнасць манаграфіі ў тым, што аўтар упершыню ўводзіць у навуковы абарот разнастайныя крыніцы па гісторыі такіх невялікіх гарадскіх цэнтраў, як Крычаў. А такія працы, безумоўна, дапамагаюць нам даведацца аб сапраўднай гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

У выданні 5 раздзелаў. Пачынаецца з археалагічных помнікаў Крычава. А.А. Мяцельскі коратка абагульняе даследаванні вучоных у нашым краі, паведамляе, дзе, у якіх крыніцах можна знайсці інфармацыю аб горадзе.

У 1987–1988, 1995–2000 гг. раскопкі археалагічных помнікаў Крычава вёў аўтар. Аб гэтых даследаваннях ідзе гаворка ў выданні.

Комплекснае вывучэнне пісьмовых крыніц, рэтраспектыўны аналіз плана Крычава 1778 г. з далучэннем

археалагічных дадзеных дазваляе ў агульных рысах прасачыць развіццё планіровачнай структуры горада на працягу XII–XVIII ст. Падрабязна расказваецца аб матэрыяльнай культуры, палітычнай гісторыі, аб тэрыторыі, адміністратыўна-гаспадарчым падзеле воласці Крычава з XII ст. да XVIII ст. Вельмі карысна, як заўважае аўтар у заключэнні, што «наша праца не завяршае, а толькі падводзіць вынікі пэўнага этапу ў шматгадовым вывучэнні Крычава. Археалагічныя і пісьмовыя крыніцы хаваюць яшчэ шмат таямніц, якія, спадзяемся, дазволяць болын грунтоўна паказаць гісторыю гэтага горада.

*Г.А. Кірпічова.*

# ЗМЕСТ

Да чытача.....17
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна.....19

**АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ –1917**

Сляды далёкага мінулага.....21
Археалагічныя помнікі Крычаўшчыны.....40
Адкуль пайшла назва горада Крычаў.....43
Героі Грунвальдскай бітвы.....45

**У складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.....**
Крычаў – горад з правам магдэбургскім.....59
Супраць шведскіх заваёўнікаў.....79
Прыгнёт і бяспраўе сялян.....80
Крычаўскае паўстанне 1743–1744 гг......82
Дакументы сведчаць.....93
Крычаўскія дзяржаўцы.....

**У складзе Расійскай Імперыі**
Дакументы сведчаць.....101
Крычаўская суднаферф.....101
Дакументы сведчаць. Вуліцы Крычава.....103
Славутыя землякі.....106
Іх шлях пралёг.....107
А.К. Меер аб Крычаўшчыне.....109
Вачыма расійскіх падарожнікаў.....110
Ваенныя пасяленні ў Беларусі.....111
Дакументы сведчаць.....113

**У паслярэформенны час**
Дакументы сведчаць.....121
Шлях да ведаў.....125
Ахова здароўя.....127
Дакументы сведчаць.....127
Рэвалюцыйныя падзеі на Крычаўшчыне.....131
Змагаўся на барыкадах.....132
Юныя крычаўцы.....133
Дакументы сведчаць.....135

**Змест**

## 1917–1941

**На крутым павароце гісторыі**


Камбеды на вёсцы ... 145
У фонд Чырвонай арміі ... 146
Партызанскі полк ... 146
Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ... 150
Загартаваны ў баях ... 154
Клятва ў Маляцічах ... 155
Першыя камсамольцы ... 157
Яны змагаліся за ўладу Саветаў ... 158
Дакументы сведчаць ... 160
Вёска ў надзвычайных умовах ... 168
Насуперак цяжкасцям ... 174
Газеты Крычаўшчыны ... 175
Дакументы сведчаць ... 176
Аб чым пісала раённая газета «Сацыялістычны шлях» ... 179
Удзельнікі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве ў 1940 г. ... 188
Крычаў перадваенны ... 190
Браты Грыгор’евы ... 191
Вернутыя імёны ... 192


## 1941–1945

**Ішла вайна народная**


На мяжы жыцця і смерці ... 217
Абаранялі Крычаўшчыну ... 220
Бой у небе над роднай вёскай ... 229
Свая зямля ратавала, давала сілы ... 230
У баях здабывалі славу ... 239
Не шкадуючы жыцця ... 244
Не колькасцю, а ўменнем ... 248
На берагах ракі Сож ... 250
Дакументы сведчаць ... 255
Акупацыйны рэжым ... 256
Дакументы сведчаць ... 260
У мяшку з калючага дроту ... 261
Дакументы сведчаць ... 263
Дзяўчынаў лагеры смерці ... 264
Паўсюль падсцерагала бяда ... 267
Дакументы сведчаць ... 269
Звесткі аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў ў г. Крычаў ... 272
Акт Крычаўскай гарадской камісіі па расследаванні злачынстваў ... 272
Фронт у тыле ворага ... 276
З успамінаў былога сакратара Крычаўскага падпольнага
райкома партыі К.А. Рэуцкага ... 286

З успамінаў В.М. Пільнікава, члена Крычаўскага падполля....................287
З успамінаў В.С. Талкачовай (Сенчыла), удзельніцы Крычаўскага падполля....................289
З успамінаў В.І. Дварачэнкі, члена Бацьвінаўскай падпольнай групы....................290
З успамінаў П.В. Недасека, жонкі І.П. Брыкава....................291
З успамінаў С.К. Дудзіна, члена Крычаўскага падполля....................293
З успамінаў І.С. Віцюгова, брата А.С. Віцюгова....................294
Бясстрашная падпольшчыца....................296
Мы не забудзем цябе, Марыя!....................298
Аня Калабашнікава....................299
Няскораныя....................301
З пачуццём выкананага абавязку.................... 309
Дакументы сведчаць. Партызанскія фарміраванні,
якія дзейнічалі на тэрыторыі Крычаўскага раёна....................313
Са справаздачы камандавання 48-га партызанскага атрада....................319
З даведкі аб партызанскім атрадзе «Анатолія Таіра»....................323
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада «Чапай».................... 326
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада «Алеся»....................327
Са справаздачы камандавання партызанскага атрада № 3....................328
Таццяна Гіндзіна....................328
Мужнасць журналіста.................... 330
Пад варожымі бомбамі.................... 331
Адважны падводнік....................332
«Лячыў» самалёты....................333
**ВЫЗВАЛЕННЕ**.................... 334
З успамінаўЛ. Анціпенкі, жыхара вёскі Цінькава....................335
Ордэн за дапамогу.................... 336
Назаўсёды ў памяці....................337
Сцяг над горадам....................338
Не ведаў страху....................341
Выжыў салдат....................342
Мацярынскі пацалунак.................... 343
Пільнасць разведчыка....................344
Дакументы сведчаць....................344
Іх пазнаёміла вайна....................355
У нашай памяці навечна....................356
Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Крычаўшчыны.................... 357
Поўны кавалер ордэна Славы....................359
Мужнасць кулямётчыка....................360
Дарогі салдацкія....................365
Аб чым пісала раённая газета «Шлях сацыялізму»....................366
Камісар дывізіі....................366
Штурман бамбардыроўшчыка....................368
Лісты з фронту....................370
Франтавыя шляхі камандзіра-танкіста....................370

**Змест**

Адплата……………………………………………………………………………………371
Подзвіг сувязіста…………………………………………………………………………..372
Не спалохаліся смерці……………………………………………………………………373
След вайны……………………………………………………………………………….373
Змагаўся ў французскім супраціўленні…………………………………………………374
Герой Аджымушкая……………………………………………………………………..376
Пад бамбёжкай, у пяпельным агні………………………………………………………377
Наш зямляк штурмаваў рэйхстаг………………………………………………………..379
Не ўсе раны зажываюць............................................................................................ 381
Апошні бой ................................................................................................................. 382
Яны прайшлі дарогамі вайны .................................................................................... 383

Ахвяры вайны
Воіны Чырвонай арміі, якія загінулі пры абароне і вызваленні раёна
ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў іпахаваны на яго тэрыторыі ................................ 466
Партызаны і падпольшчыкі, якія загінулі ў барацьбе
з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ........................................................................... 472
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай
Айчыннай вайны ў 1941–1945 гг. ............................................................................. 473

**1945 – ДА НАШЫХ ДЗЁН**

Год за годам, падзея за падзеяй ................................................................................ 545
За газетным радком....... .. ......................................................................................... 563
Прадпрыемствы Крычаўшчыны................................................................................. 581
З гісторыі школ ........................................................................................................... 587
Вызначыліся працай ................................................................................................... 590
Героі Сацыялістычнай Працы .................................................................................... 590
Яны ўзнагароджаны.................................................................................................... 598
Заслужаныя работнікі Рэспублікі. Беларусь .............................................................. 611
Яны нарадзіліся на Крычаўшчыне ............................................................................. 616
Ганаровыя грамадзяне ............................................................................................... . 634
Загінулі ў Афганістане...................................................................... ........................641

**З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ .................................................... 643**
З гісторыі населеных пунктаў ................................................................................... 677

Раённая камісія па стварэнні Хронікі выказвае шчырую ўдзячнасць грамадскасці раёна, якая прымала ўдзел у зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі, а таксама кіраўніку арганізацыйна-метадычнага цэнтра па выданні гісторыка-дакументальных Хронік Памяці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Б.В. Ульянку за выяўленне дадатковых архіўных дакументаў, літаратурных крыніц і дапамогу ў складанні Хронікі «Памяць. Крычаўскі раён».

Каляровыя здымкі В. Бысава і І. Косціна, а таксама здымкі з фондаў рэдакцыі раённай газеты, з раённага краязнаўчага музея, грамадскіх і асабістых архіваў.

**Памяць:** Гіст.-дакум. Хроніка Крычаўскага раёна. – Маладзечна: П 15 УП «Друкарня «Перамога», 2004. 711 с.: іл.
ISBN 985-6541-42-5

У кнізе асвятляецца гісторыя Крычаўшчыны ад старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра цікавыя падзеі, што адбываліся тут, пра знакамітых людзей, якія былі звязаны лёсам з гэтым кутком беларускай зямлі. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Прыводзяцца спісы партызан, падпольпчыкаў, воінаў Чырвонай арміі, якія аддалі жыццё ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ці сталі ахвярамі фашысцкага тэрору, землякоў, якія прайшлі франтавымі дарогамі. Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў раёна, што сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій. Асобны раздзел прысвечаны матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, гісторыі населеных пунктаў.

**УДК 94.7.6 ББК**
**633 (4 Беи)**